Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся
Proletariusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

ЧАЦЬВЕРГ
20 жніўня 1931 г.
№ 191 (3280)

ТВАРАМ ДА ГАРАДЗКОЙ ГАСПАДАРКІ!

Праблема разьвіцьця гарадзкой камунальнай гаспадаркі ва ўмовах шаркага росту прамысловасьці ў нашай краіне набывае асаблівае значэньне. Колькасны рост рабочае клясы, разьмяшчэньне і матар'яльна-культурнае абслугоўваньне рабочых мас, ліквідацыя акруг і пабудова новых гарадоў, арганізацыя буйных трастаў, калгасаў і МТС «па-новаму ставяць перад партыяй праблему гораду ў рэканструкцыйны пэрыяд, праблему перабудовы старых і будаўніцтва новых гарадоў» (З паст. чэрв. пленуму ЦК УсеКП(б)).

Тэмпы разьвіцьця гарадзкой камунальнай гаспадаркі да самага апошняга часу далёка адставалі ад агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Між тым, гарадзкая гаспадарка, яна засталася ў спадчыну ад буржуазіі ў выніку Кастрычнікавай рэвалюцыі, пачынаючы з часу імпэрыялістычнай вайны і на працягу першых год пасьля Кастрычніка, была ў агоне. У час імпэрыялістычнай вайны ў гарадзкую гаспадарку памешчыцка-буржуазнай Расіі ня толькі не укладалася ніякіх сродкаў, але нават не рабілася самага неабходнага ремонту. Дамы і цэлыя кварталы пераваліся ў руіны. Значная частка вулічнай плошчы, водаправодная і каналізацыйная сеткі не рамантаваліся і выходзілі са строю.

Контрэвалюцыйная «інтэрвэнцыя і гаспадараньне» белых генэралаў нічэ больш паглыбілі разруху гарадзкой гаспадаркі.

У выніку імпэрыялістычнай і грамадзянскай войнаў частка гарадоў УССР і БССР былі асабліва разбураны. Некаторыя з беларускіх гарадоў (Віцебск, Мозыр, Бабруйск, Менск, Магілеў, Гомель) былі напалову спалены і станавілі сабою руіны.

Аднаўленчы пэрыяд гаспадарчага будаўніцтва ў нашай краіне не даваў магчымасьці ў першыя гады пасьля грамадзянскай вайны паставіць у цэнтры ўвагі пытаньне капітальнага будаўніцтва камунальнай гаспадаркі як на ўсім СССР, так і ў БССР. Толькі з уступленьнем у рэканструкцыйны пэрыяд сацыялістычнага будаўніцтва, практычна пачынаючы з першага году пяцігодкі, у найбольш буйнейшых гарадох Савецкага Саюзу пачынаецца плянавая перабудова гарадзкой камунальнай гаспадаркі.

Чэрвеньскі пленум ЦК УсеКП(б) праблему разьвіцьця гарадзкой камунальнай гаспадаркі паставіў у цэнтры ўвагі партыйных, савецкіх, прафсаюзных і гаспадарчых органаў, высунуўшы перад імі **«баявую задачу хутчэйшай ліквідацыі адставаньня гарадзкой гаспадаркі ад агульнага разьвіцьця і рашучага пералому ў тэмпах яе разьвіцьця»**. Гэтую задачу пленум ЦК УсеКП(б) дэталізаваў наступным чынам: «У сучасны момант, побач з завяршэньнем аднаўленчага працэсу, там, дзе яшчэ гарадзкая гаспадарка цалкам не адноўлена, галоўная задача заключаецца ў тым, каб разгарнуць работу па пашырэньні, перабудове і разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі дапасавальна да патрабаваньняў, якія падаюцца зараз бурнымі тэмпамі індустрыялізацыі, павялічэньнем гарадзкога насельніцтва, ростам бытавых і культурных запатрабаваньняў шырокіх працоўных мас».

Здавалася-б, што пасьля такой катэгарычнай і вычарпальнай дырэктывы, якой зьяўляецца пастанова чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) аб разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі, павінен адбыцца пералом у адносінах да камунальнай гаспадаркі з боку партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый і асабліва з боку гарадзкіх саветаў. Аднак, на сёньняшні дзень мы гэтага ня маем. Пастановы чэрвеньскага пленуму па гэтым пытаньні яшчэ належным чынам не ажыцьцявіліся ў канкрэтных мерапрыемствах саветаў, не зрабіліся праграмай практычнай работы для кіруючых работнікаў камунальнай гаспадаркі. Ня гледзячы на чоткае паказаньне пленуму ЦК УсеКП(б) адносна пераходу да плянавага будаўніцтва камунальнай гаспадаркі, з папярэдняй разгорнутай «сур'ёзнай навукова-тэхніка-эканамічнай распрацоўкай пляну разьвіцьця гарадзкой гаспадаркі», ні ў адным з гарсаветаў БССР фактычна няма абгрунтаванага пляну будаўніцтва. Замест плянаў камунальнага будаўніцтва ў гарсаветах маюцца дзяляцкія меркаваньні аб выпадковых рамонтах на бліжэйшы пэрыяд часу, або просты пералік аб'ектаў будаўніцтва бяз сур'ёзнага абгрунтаваньня неабходнасьці будаўніцтва, першачарговасьці і г. д., бяз яснага разуменьня пэрспэктыў камунальнай гаспадаркі.

Фактычна барацьба за дабрабыт гарадзкога насельніцтва адрываецца ад барацьбы супроць адмоўных бакоў капіталістычнага гораду, які па выражэньні Энгельса зьяўляецца прытулкам «заражэньня вады, паветра і глебы», «крыніцай хвароб», дзе «цягнуць хваравітае існаваньне масы».

Пры плянаваньні гарадзкой камунальнай гаспадаркі эвычайна ня прымаецца пад увагу пэрспэктыва зьнішчэньня процілегласьці паміж сельска-гаспадарчай працай і працай на прамысловасьці паміж фізычнай і разумовай працай. Звычайна ня прымаецца пад увагу дырэктыва пленуму , якая дадзена адносна пляніроўкі Масквы, дзе сказана, што «не павінна дапускацца надмерная канцэнтрацыя на невялічкіх вучастках вялікіх масываў насельніцтва прадпрыемстваў, школ, больніц, тэатраў, клюбаў, магазынаў, сталовак і інш.».

Гарадзкія саветы, паасобныя тэхцы гарсавету яшчэ пакуль-што ня сталі тварам да камунальнай гаспадаркі, не падыйшлі да канкрэтнага кіраўніцтва камунальным будаўніцтвам, не зрабіліся сапраўднымі гаспадарамі гарадзкой гаспадаркі.

Вось чаму ў пастанове чэрвеньскага пленуму ЦК асабліва яскрава і рэзка падкрэсьлены недахопы ў кіраўніцтве камунальнай гаспадаркай з боку гарсаветаў і чотка паказаны напрамкі далейшай работы.

«Гарадзкія саветы, як органы пралетарскай улады ў гарадох, павінны перабудаваць сваю работу такім чынам, каб ў кожную галіну гарадзкой гаспадаркі былі ўцягнуты да актыўнага ўдзеле ў рабоце ў першую чаргу дэпутаты саветаў» (З паст. чэрв. пленуму ЦК УсеКП(б)).

Праблема разьвіцьця гарадзкой камунальнай гаспадаркі для вырашэньня патрабуе рэзкага пералому ў адносінах да гаспадаркі гарадоў з боку партыйных, савецкіх і прафэсыянальных арганізацый, патрабуе мабілізацыі ўсёй пралетарскай грамадзкасьці на барацьбу за рэканструкцыю камунальнай гаспадаркі, за новы сацыялістычны горад.

Дырэктывы партыі аб разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі—аб плянавым будаўніцтве, аб барацьбе за кадры, аб удзеле ў будаўніцтве гарадзкой гаспадаркі зацікаўленых арганізацый павінны на мясцох ператварыцца ў канкрэтную праграму работы, павінны паскорыць «ліквідацыю адставаньня гарадзкой гаспадаркі ад агульнага разьвіцьця».

Першы усесаюзны зьезд польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў-зьезд барацьбітоў за вялікае мастацтва бальшавізму

Аднаму з перадавых атрадаў рэвалюцыйнага літаратурнага руху

Міжнароднае аб'яднаньне рэвалюцыйных пісьменьнікаў горача вітае зьезд польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў», які адкрываецца сёньня ў сталіцы вольнай савецкай Беларусі. Самы факт скліканьня гэтага пістарычнага зьезду,--найлепшы довад таго, што толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту працоўныя масы ўсіх нацыянальнасьцяй маюць магчымасьць поўнасьцю разьвіваць сваю культуру, нацыянальную па форме і пралетарскую па сваім зьмесьце.

МАРП спадзяецца, што польскія пралетарскія пісьменьнікі СССР, якія ўваходзяць праз УсеАПП у склад нашай міжнароднай рэвалюцыйнай пісьменьніцкай арганізацыі, стануць адным з перадавых атрадаў нашага руху ў яго барацьбе за сусьветны кастрычнік.

Канкрэтныя задачы, якія ставіць МАРП ужо на сёньняшні дзень перад польскімі пралетарскімі пісьменьнікамі СССР выкажа зьезду наш прадстаўнік тав. **Бруно Ясенскі**.

Мы пераконаны, што вы будзеце правільна працаваць і што ў далейшым мы будзем помагаць разам. Рэвалюцыйныя пісьменьнікі ўсяго сьвету шлюць вам гарачае пралетарскае прывітаньне.

Сакратарыят міжнароднага Аб'яднаньня рэвалюцыйных пісьменьнікаў:

Бэла Ілеш,

Асоцыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў Нямеччыны:
Іоганэс Р. Бэхэр.

Джон Рыд Клюб: (Амэрыка):
Майкл Голд, А. Магіл,

Усеяпонская Фэдэрацыя пралетарскага мастацтва (НАПФ):
Фудзіморы, Токунага,

Асацыяцыя Пралетарскіх пісьменьнікаў Аўстрыі:
З. Фабры,

Асацыяцыя вэнгерскіх пралетарскіх пісьменьнікаў:
А. Гідаш,

Асацыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў Чэха-Славакіі:
Л. Новамэскі, В. Клемэнціс,

Ліга левых пісьменьнікаў Кітаю:
З. Сяо.

Анры Барбюс (Францыя). Лінард Лайцэн (Латвія), А. Бакалаў (Баўгарыя), Хамдз і Сялям (Эгіпэт), М. Нахана (Румынія), Гарольд Хэзлоп (Англія), Лахуці, (Пэрсія).

Вітаньне ўсесаюзнаму зьезду

Усесаюзны зьезд польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў павінен вызначыць далейшыя шляхі разьвіцьця польскай пралетарскай літаратуры. Зьезд мае вялізарнейшае палітычнае значэньне і ня толькі ў межах СССР.

У той час, як у фашысцкай Польшчы пануе нічуваны сацыяльны і нацыянальны ўціск усіх працоўных, БССР, якая была пры царскай уладзе аднэй з самых адсталых у эканамічных і культурных адносінах «акраін» Расійскай імпэрыі з нячуваным нацыянальным прыгнечаньнем, зараз стаіць па пісьменнасьці на другім месцы ў сям'і сацыялістычных савецкіх рэспублік.

Пралетарская літаратура павінна, разам з іншымі галінамі культурнага будаўніцтва быць зброяй у руках рабочае клясы, арганізуючы працоўныя масы на бязьлітасную барацьбу супроць клясавага ворага, супроць адхіленьняў ад генэральнай лініі партыі, за пабудову сацыялізму, за сусьветны кастрычнік.

Гэтыя задачы стаяць і перад усесаюзным зьездам польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў.

Калегія НКА БССР горача вітае ўсесаюзны зьезд польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў.

Няхай жыве 1-ы Усесаюзны Зьезд Польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў!

Няхай жыве камуністычная партыя —адзін кірунак культбудаўніцтва.

Народны Камісар Асьветы БССР
ПЛАТУН.

На зьезьдзе

17 жніўня ў Менску адкрыўся 1-шы Усесаюзны зьезд польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў. Сам гэты факт зьяўляецца лішнім доказам правільнага вырашэньня нацыянальнай палітыкі ў Савецкім Саюзе. Гэты факт зьяўляецца доказам, што толькі Ленінская нацпалітыка забясьпечвае бурнае разьвіцьцё нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьместу культур усіх народаў вялікага Савецкага Саюзу.

Зьезд адчыняе кароткай прамовай рэдактар «Трыбуны Радзецкай» тав. Нэйман.

У прэзыдыум зьезду аднагалосна абраны наступныя таварышы: Бруна-Ясенскі, Р. Стандэ, Чарнушэвіч, Кавалёнка, Лынькоў, Нэйман, Прынц, Сьлівінскі, Сьвішч, Сьцібальскі і інш. У гаворбы прэзыдыум пад бурныя воплескі зьезд абраў палітбюро ЦК КП(б)Б і ЦК КПП тт. Ленскага, Тэльмана і Максіма Горкага.

Зьезд віталі: ад ЦК КП(б)Б тав. Чарнушэвіч, ад УсеАПП'а тав. Кавалёнка, ад БелАПП'а тав. Лынькоў.

З прывітальнымі прамовамі ад рабочых Менску выступалі дэлегаты за воду «Бальшавік» і «Камунар». Ад калгасьнікаў зьезд вітала дэлегацыя польскага нацыянальнага калгасу «Ка мінтэрн» (Койданаўскага р.).

З прывітальнай прамовай да зьезду выступаў таксама прадстаўнік Камуністычнай Партыі Польшчы.

Зьезд прыняў рэзалюцыю пратэсту супроць разгулу белага тэрору ў Польшчы.

Усесаюзны зьезд польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў. На здымку: агульны выгляд залі зьезду.

18 ЖНІЎНЯ. Зьезд заслухаў даклад сакратара УсеАПП'а тав. Кавалёнка аб задачах літаратуры і культбудаўніцтва ў Савецкім Саюзе.

19 ЖНІЎНЯ. З вялікім дакладам аб задачах польскай пралетарскай літаратуры ў Савецкім Саюзе выступіла тав. Камянецкая. У спрэчках выказаліся т. т. Малецкі, Банская, Гараўскі і інш.

Дэлегацыя калгасьнікаў Койданаўшчыны запрашае ўдзельнікаў зьезду да сябе ў госьці. У дэлегацыю да калгасьнікаў зьезд выдзяляе дэлегацыю ў якую ўваходзяць тт. Стандэ, Сьвішч, Румашэўскі.

Пасьля абедзенага перапынку ў спрэчках выступіў тав. Бруна-Ясенскі.

БРУНО ЯСЕНСКІ

Слова пра Якуба Шэлю

(Урывак з паэмы)

У месьце Львове людна, клумна,
Лямп, як тых зярнят у гумнах,
Па бакох, як лялек, гмахаў,
Пасярод дарога—свахай.
У месьце Львове, белым месьце,
У кожным доме вакон з дзьвесьце.
У кожным з вокан красна пані,
Шыты золатам убраньні.
І як толькі вокам скінуць,
Кожны дом, як сот пчаліны:
Сам пляскаты, зьверху гладкі,
А пакоі, як шуфлядкі.
У месьце Львове сьцежкай чыстай
Ходзіць панства ганарыста,
А паненкі, нібы павы—
Не падымуць ножкі нават.
З вуліц люд плыве разводзьдзем
І жандар між люду ходзіць,—
Хто ісьці ў такт нязгодны,
Таго зараз да халоднай.
У месьце Львове аднэй меры
Растуць дрэвы гнеда-шэры,
Як буслы там на пярэсьпе,
На аднэй яны назе сьпяць.
На іх лісьце — арнамэнты,
На іх жменяй—рыямэнты,
Бартаўнік стаіць пад кожным,
З іх сарваць—ані ня можна.
У месьце Львове ксяндзоў плойма,
У рад касьцёлы стаяць стойма.
У касьцёлах мша штодзенна,
Зьяўне ўбёраў неацэнна.
У касьцёл, у жар ці ў хлюпу,
Хто бяднейшы—няма ўступу.
Едзе панства—шнур карэтаў—
Як цары да Назарэту.
Сядзяць старцы пад касьцёлам,
Сядзяць, сьвецяць целам голым—
Пад рызьзём палічыш косьці,
Просяць, шэпчуць, мыкаць штосьці.
З кім бяда — да іх ты проша,
Пройдзе пані—кіне грошык.
Пройдзе старжнік з тоўстай мордай—
Каму арышт, каму горай.
У месьце Львове—гмахаў розных: —
З боку шкляны, сам парожны,
З-за вакон шкляных тых скрынак,
Як у полі мыдляў,—шынак.
Люд з бяднейшых тут ўсялякі
Пхнецца глянуць на прысмакі.
Кожны тут палкае сьліну,
Гарляк бегае бяз спыну.
Там, дзе ежы акно копы,
Ходзіць ноччу вёскі клопат.
Стукне ў цэглу, гляне вокал,
У палацы кіне вокам.
Раніцой на ўсіх заводах
Зык, як сотні баб пры родах,
Аж дрыжаць муры й панове
У белым месьце, месьце Львове.

Пераклад з польскай мовы Ул. Ж.

Братом па клясе, верным барацьбітом за пралетарскую рэвалюцыю ў Польшчы--палітзьняволеным фашысцкай Польшчы

РАБОЧЫМ і ПРАЦОЎНЫМ СЯЛЯНАМ ПОЛЬШЧЫ, ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ і ЗАХОДНЯЙ УКРАІНЫ

Дарагія таварышы! Гаспадарчае становішча капіталістычных краін усе больш пагаршаецца. Сусьветны эканамічны крызіс давёў усе галіны гаспадаркі да руіны. Выключэньне складае толькі ваенная прамысловасьць, якая працуе з поўнай нагрузкай—выконвае заказы капіталістаў па падрыхтоўцы вайны супроць Савецкага Саюзу—ўдарнай брыгады сусьветнага пралетарыяту.

Польскі фашызм, сьціснуты пятлёй эканамічнага крызісу, шукае выхаду ў задушэньні магутнай рэвалюцыйнай хвалі працоўных мас Польшы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны. Польскі фашызм у саюзе з сацыял і нацыянал - фашызмам імкнецца насадзіць магільную цішыню ў тылу на Заходняй Беларусі і Заходняй Украіне, расчысьціць дарогу да ўзброенага нападу на СССР.

10 тысяч паліт-зьняволенных пакутуюць у астрогах фашысцкай Польшчы. Штодзённыя масавыя арышты павялічваюць іх лічбу з кожным днем. Абвостранае наступленьне турэмных катаў пагражае фізычным зьнішчэньнем паліт-зьняволеных.

Мы, калгасьнікі, беднякі, серадняк-аднаасобнікі—заўтрашнія калгасьнікі, Малевіцкага сельсавету Жлобінскага раёну, сумесна з нашымі шэфамі—рабочымі дэпо, сабраўшыся ў дзень нашай перамогі на фронце сацыялістычнай перабудовы вёскі, у дзень завяршэньня ў асноўным суцэльнай калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак на тэрыторыі сельсавету—ўзьнімаем свой рашучы голас пратэсту супроць нячуваных зьдзекаў польскага фашызму над вамі—барацьбітамі за Савецкую Польшчу, вам, знаходзячымся за кратамі польскіх турмаў, працоўным масам Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны—мы шлём свае шчырае, брацкае прывітаньне.

Мы пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі дабіліся вялізарнейшых перамог—на фронце сацыялістычнага будаўніцтва. У рашаючай барацьбе з кулацтвам і яго агентамі, правымі апартуністымі, мы аб'дналі ў калгасы нашага сельскага савету 322 бядняцка-сярэдняцкіх гаспадарак, што складае 74 проц. усіх гаспадарак.

Мы пасьпяхова праводзім гаспадарчае замацаваньне калгасаў і працуем над вырашэньням праблем сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Браты па клясе, паліт-зьняволеныя Польшчы, мы чуем ваш голас. Вы не адны. Вам на дапамогу ідзе магутная рэвалюцыйная хваля, якая ўшчэнт зьнішчыць капіталістычную сыстэму.

Мы працягваем вам сваю брацкую руку, арганізуючы шырокі збор сродкаў сярод калгасьнікаў, бедняко ў і серадняко ў сельсавету і ўносім на адказ у адозву ЦК МОПР'у Польшчы, Заходняй Беларусі і Украіны 500 руб.

Мы заклікаем вас, працоўныя Польшы, Заходняй Беларусі і Украіны, стаць пад сьцяг камуністычнай партыі, для барацьбы з польскім фашызмам, за Савецкую Польшчу.

Мы заклікаем рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і серадняко ў—аднаасобнікаў Жлобінскага раёну, узьняць свой голас рашучага пратэсту, арганізаваць шырокі збор сродкаў на дапамогу палітзьняволеным Польшчы і іх семьям.

Прэч белы тэрор! Прэч фашысцкую дыктатуру Пілсудзкага! Прэч фашыцкі турэмны рэглямант! Прэч арганізатараў нападу на СССР!

Няхай жыве кампартыі і МОПР Польшчы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны! Няхай жыве рабоча-сялянская Ўлада Польшы, Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны! Няхай жыве сусьветная пралетарская рэвалюцыя!

Ліст прыняты на тысячным мітынгу калгасьнікаў, беднякоў і серадняко ў Малевіцкага сельсавету разам з шэфамі—рабочымі Жлобінскага дэпо.

Зьверствы польскіх фашыстаў

Замучаны ў вастрозе рабочы Губэрман

БЭРЛІН, 17-VIII. З розных турмаў Польшчы працягваюць паступаць весткі аб зьверскім рэжыме, якому падпадаюць палітзьняволеныя. За найменшую праяву пратэсту палітзьняволеных зьбіваюць, кідаюць у карцэр, пазбаўляюць пабачэньняў і перапіскі на цэлы месяц.

У часе калектыўнага пратэсту палітзьняволеных Петракоўскай катаржнай турмы, галадаўшых, апранутых у сьмірыцельныя кашулі, зьвязвалі сыпной адзін да аднаго, выкручваючы ім рукі. У такім-жа становішчы іх пакінулі на мокрай падлозе ў працягу трох дзён. Другі спосаб мучэньня заключаецца ў тым, што зьняволенаму надзяваюць на галаву коўдру і б'юць чым папала. Так быў замучан на сьмерць 22-гадовы рабочы Губэрман, які памёр у Петракоўскай турме.

Пісьмовыя пратэсты канфіскуюцца, старасты за перадачу заяў ад імя калектыву садзяцца ў карцар, пазбаўляюцца пабачаньняў, прагулак і г. д.

Пракурор акруговага суду, якому палітзьняволеныя заявілі пратэст з прычыны іх зьбіваньня надзірацелямі, адказаў:

«Будзьце задаволены тым, што ў вас засталіся цэлымі рукі і ногі. А тое, што вам паранілі галовы ключамі і што на целе ў вас сінцы,—гэта дробязь».

Ня лепш становішча ў Плоцкай турме. 17-гадовага цяжка хворага Пржыбыльскага, які ляжаў у гарачцы, сьцягнулі ўначы з пасьцелі і голага кінулі ў карцар на каменную падлогу. Па дарозе туды яго бязьлітасна зьбілі, заціскаючы рот, каб ня былі чуты яго крыкі.

З некалькімі дзесяткамі беспрацоўных, арыштаваных 2 ліпеня, у крывавы чацьвер (выступленьне беспрацоўных у Плоцку), абыходзяцца як з бандытамі і не дазваляюць палітычным перадаваць ім харчы.

Калі палітзьняволеныя «Павьяка» (варшаўская турма) паскардзіліся пракурору акруговага суду на зьбіваньні, пракурор, адказаў у духу яго петракоўскага калегі: «Мяне гэта не датычыцца і мала турбуе, калі вас б'юць.

СЫСТЭМА ДОПЫТАЎ...

Мал. М. АСОТА.

У фашысцкай Польшчы

Прэч тэрор!

МАГУТНАЯ ХВАЛЯ ПРАТЭСТАЎ РАСЬЦЕ.

Рабочыя з прадпрыемстваў і саўгасаў Гомлю, калгасьнікі выносяць на сваіх агульных сходах пратэсты супроць катаваньня польскім фашысцкім урадам палітзьняволеных.

Рабочыя майстэрні воднікаў Гомельскага воднага вузла з абурэньнем пратэстуюць супроць разьюшанага тэрору над рэвалюцыйным пралетарыятам Польшчы і над палітзьняволенымі, якія пакутуюць у засьценках польскага фашызму.

У адказ на гэтыя зьверскія расправы рабочыя майстэрняў абяцаюць усімі сіламі дапамагчы выкананьню пляну асеньня-зімовых перавозак.

1500 рабочых і служачых швэйнай фабрыкі «Камінтэрн» з абурэньнем суструлі паведамленьне аб зьверскіх расправах у беларускай Польшчы. Рабочыя ў сваёй рэзалюцыі запісалі: «зграя памешчыкаў хоча гэтым адцягнуць сваё панаваньне, паслабіць рэвалюцыйны рух, барацьбу за волю, якая ўзьнімаецца шматмільённай масай.

Але дарэмна, ні крывавы фашысцкі рэглямант, ні зьдзекі, ні катаваньні ня змогуць зламаць змагароў Польшчы за вызваленьне працоўных Заходняй Беларусі і Украіны.

Я. Р.

Сакратарам райкомаў КП(б)Б Старшыням райвыканкомаў

Дырэктывы ЦК аб пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну ня выкананы, уборка лёну і яравых збожжавых праходзіць ўсё яшчэ нездавальняюча, у выніку чаго па зярнёвых культурах маем вялікія страты. Плян сіласаваньня кармоў знаходзіцца пад пагрозай зрыву, падрыхтоўка да асеньняй пасеўнай кампаніі ў большасьці раёнаў праходзіць самацёкам, падняцьцё зябі па сапраўднаму не пастаўлена ў цэнтры ўвагі, што пагражае заняжкай асеньняй сяўбы і невыкананьнем пляну зяблевага ворыва, асабліва па падняцьці паліны.

ЦК КП(б)Б і СНК БССР катэгарычна патрабуюць перабудаваць работу па сапраўднае ўзмацненьне пераходу калгасаў на зьдзельшчыну і на іх гаспадарчае замацаваньне, дабіцца скончэньня ўборкі лёну ва ўстаноўленыя ЦК тэрміны, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на своячасовую мочку, расьціл і пераапрацоўку лёну і падрыхтоўку яго для здачы дзяржаве.

Уборку яравых зярнёвых, апроч позьніх пасеваў абавязкова скончыць да 25-га жніўня. Разгарнуць работу па сяўбе, пасіліць малацьбу, падрыхтоўку насеньня для сяўбы скончыць у вызначаныя скарочаныя тэрміны з тым, каб зараз пераключыцца на падняцьце зябі. На працягу дэкадніка дабіцеся пералому ў выкананьні пляну сіласаваньня.

Аб прынятых мерах 30-га жніўня падайце у ЦК спэцыяльныя даклады. Палепшыце апэрацыйны вучот правядзімых кампаній, забясьпечце ў далейшым своячасовую прысылку Наркамзему зводак, а таксама дакладу для ЦК і ўраду.

ЦК КП(б)Б ГЕЙ.
СНК БССР БЭНЭК.

ЗВОДКА

ходу будаўніцтва лёназаводаў па БССР на 10-га жніўня 1931 г.

Назва заводаў	Тэрміны сканч.	Вытворчы корпус у процантах	Астатняе будаўн. у процантах
Вушацкі	20-IX—31 г.	57	39
Межанскі	„	55	46
Копыскі	„	55	49
Крупскі	„	85	71
Чырвонапольскі	„	71	60
Гарадоцкі двухтурбінны	1-X—31 г.	57	36
аднатурбінны	„	60	24
Любаньскі (пяньковы)	„	23	38
Ветрынскі	„	87	45
Багушэўскі	„	26	49
Хоцімскі	„	30	60
Вульскі	1-XI—31 г.	68	32
Высачанскі	„	39	27
Бігосаўскі	„	22	11
Дубровенскі	„	53	42
Лепельскі	„	37	35
Халопеніцкі	„	56	47
Чашніцкі	„	38	25
Сураскі	1-XII—31 г.	32	41
Горацкі	„	66	78
Чарэйскі	1-XII—31 г.	30	21
Талочынскі	„	54	44
Коханаўскі	„	43	31
Крычаўскі	„	53	32
Кармянскі (пяньковы)	„	37	41
„ (ільняны)	„	23	16
Касьцюковіцкі	„	33	40
Бялынецкі	„	48	35
Церахаўскі	„	35	24
Уваравіцкі	„	22	25
Пухавіцкі	„	17	12
Расонскі	1-I—32 г.	40	20
Асьвейскі	„	30	22
Бешэнковіцкі	„	40	33
Сіроцінскі	„	43	40
Круглянскі	„	54	52
Ляднянскі	„	29	23
Сененскі	„	42	27
Чавускі	„	33	44
Мсьціслаўскі	„	67	52
Касьцюковіцкі (пяньковы)	„	20	18
Магілеўскі	„	8	20
Бабруйскі	„	8	4
Рагачэўскі	„	19	15
Рэчыцкі	„	46	39
Разам	—	42	36

Засталася адна дзкада да навучальнага году

1 верасьня, у „Дзень вучобы“, работу школ—на поўны ход

На чорную дошку—Дубровенскі раён, Буда-Кашалёўскаму раёну таксама пагражае чорная дошка

Адсутнасьць адзінага культпляну адбіваецца на падрыхтоўцы да навучальнага году

куставой нарады інспэктароў нарасьветы і культпропаў РК КП(б)Б.

17 жніўня ў Наркамасьветы адбылася куставая нарада інспэктароў нарасьветы і культпропаў райкомаў КП(б)Б, якая разглядала пытаньне падрыхтоўкі да новага навучальнага году.

Як дадатны момант нарада адзначыла, што па ўсіх раёнах райкомамі і райвна была прароблена вялікая работа ў гэтай справе. Узяты на вучот дзяўніцтва новых школ (Койданаўскі, Старадароскі, Бабруйск, Крупскі і г. д.). Галоўнай перашкодай гэтага зьяўляецца адсутнасьць неабходных будаўнічых матар'ялаў (асабліва жалеза, цьвікоў). Недастатковы ўдзел у справе школьнага будаўніцтва з боку савецкіх, каапэратыйных і калгасных арганізацый. У Койданаўскім раёне калгасы да самага апошняга часу не давалі для будаўніцтва школ цесьляроў.



Брыгада перад выездам у с.-с. для ліквідацыі прарыву ў падрыхтоўцы да навучальнага году. (Ельскі р.).

...е дзеці школьнага ўзросту, намечаны і праводзяцца ў жыцьцё мерапрыемствы з мэтаю ахапіць іх школамі, зроблен вучот няпісьменных і малапісьменных. У асноўным скончана разьмеркаваньне настаўнікаў, якія ёсьць ў раёне за пэўнымі школамі. У большасьці раёнаў і гарадоў (Койданаўскі, Менскі і інш.) ужыты захады да падрыхтоўкі нехапаючых настаўнікаў шляхам арганізацыі адпаведных курсаў. Адначасна ўжыты захады па падвышэньні кваліфікацыі настаўнікаў праз спэцыяльныя сэмінары і г. д.

Прароблена таксама значная работа ў напрамку падрыхтоўкі да забесьпячэньня вучняў гарачымі сьнеданьнямі, абуткам, вопраткай і інш.

Але поруч з гэтым на нарадзе выявілася і шмат недахопаў, якія ў некаторых выпадках ставяць падрыхтоўку пад пагрозу зрыву. Так, па пэўным радзе раёнаў ня скончана будаўніцтва школ. Выяўлен таксама недахват падручнікаў, асабліва для першых гадоў навучаньня (Бабруйскі, Крупскі Старадароскі раёны) і школьнага абсталяваньня.

Як асабліва слабае месца нарада канстатавала адсутнасьць адзінага культпляну па ўсіх раёнах. Толькі ў Легойскім і Койданаўскім раёнах у гэтым напрамку зроблены першапачатковыя крокі. У выніку і атрымліваецца тое, што спэцыяльныя каапэратывы, калгасаюзы і асабліва камсамольскі ўсенавучу,—стаяць фактычна ў баку ад культурнага будаўніцтва.

Пасьля дакладу тав. **Платуна** нарада намеціла рад практычных мер для зьнішчэньня паасобных прарываў, як у падрыхтоўцы да навучальнага году, таксама і ў напрамку перабудовы ўсёй работы школы ў адпаведнасьці з задачамі палітэхнізму і сацбудаўніцтва.

А. С—ка.

У Дубровенскім раёне ня рыхтуюцца сустрэць навучальны год

Дуброўна (наш. кар.). Ня гледзячы на сыгналы «Савецкай Беларусі» аб прарыве на культфронце ў Дубровенскім раёне, ня гледзячы на адпаведную пастанову прэзыдыуму РВК аб ліквідацыі прарыву, належнага зруху не назіраецца.

Будаўніцтва і рамонт школ ідзе настолькі марудным тэмпамі, што ў выпадку не павялічэньня іх, пачатак навучальнага году будзе сарваны.

Да гэтага часу не праведзен столы вучот няпісьменных і дзяцей школьнага ўзросту. Няма належнага абсталяваньня ў школах. Заказ зроблены райспажыўсаюзу, але як ідзе яго выкананьне ніхто не правяраў! і ня цікавіцца. Курсы для падрыхтоўкі культармейцаў і ліквідатараў ніхто яшчэ ня думае нават адкрываць. Рады настаўніцтва значна засьмечаны, ёсьць «быўшыя людзі», якія вядуць працу па разлажэньні калгасаў. (Кудраўцаў і інш). Інспэктура і ня думае з імі разьлічыцца на тэй падставе, што не хапае кадраў.

Ёсьць выпадкі, калі масы самі бяруцца за культбудаўніцтва. Калгасьнікі в. Гуракі, Сватошыцкага сельсавету, узяліся ўдарнымі тэмпамі за будаўніцтва школы.

Раён ня справіўся з задачай—даць Чырвонай армі пісьменнага прызыўніка—значная частка дапрызыўнікаў і на сёньняшні дзень няпісьменная.

Райспажыўсаюз ставіць пад пагрозу забесьпячэньне дашкольных і школьных устансў самымі неабходнымі рэчамі.

Безадкладна патрэбна РВК, райінспэктуры, райспажыўсаюзу, РКС пераключыць свае нікудышныя тэмпы ў падрыхтоўцы да навучальнага году на сапраўды ўдарныя. Трэба ўзьняць калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы на барацьбу за ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК КП(б)Б у галіне культбудаўніцтва. Толькі пры такіх умовах можна папярэдзіць насоўваючыйся прарыў.

Макарэвіч.

Рыхтуюцца добра... на паперы

Па Буда-Кашалёўскім раёне праца па падрыхтоўцы да навучальнага году ня рушыцца з месца. Праўда, гэтае пытаньне заслухана 10 жніўня на пленуме РВК. Даны дырэктывы, указаньні, усё як трэба,—ніхто не падкапаецца. Толькі са справай крыху горш. Буда-Кашалёўская школа, якая паводле пляну павінна быць пабудавана да 1 верасьня, яшчэ не адбудавана і напалову. **Па сельсаветах школы яшчэ не рамантаваліся, а засталося да пачатку заняткаў 11 дзён. Вучот дзяцей і вяпісьменных яшчэ не праведзен.** Не хапае шмат настаўнікаў.

Мясцовыя партыйныя, камсамольскія, савецкія і грамадзкія арганізацыі павінны неадкладна ўзяцца за штурм па ліквідацыі прарываў у падрыхтоўцы да навучальнага году. Дырэктыва ЦК КП(б)Б па гэтым пытаньні павінна быць выканана.

Дзямешчанка.

Мабілізаваць унутраныя рэсурсы на школьнае будаўніцтва

Слуцак. Наш. кар.). Падрыхтоўка да навучальнага году на Случчыне разгарнулася ва ўсю шырыню. Школьная сетка пашырана на 19 камплектаў, якія ўжо ўкамплектаваны настаўнікамі. Пятыя групы, ШКМ на вёсках таксама ўкамплектаваны.

Падлік няпісьменных і малапісьменных ужо зроблены. Частка падручнікаў паступіла і адразу-ж накіравана на вёскі, а разам сшыткі і частка школьных праграм.

Зусім дрэнная справа з будаўніцтвам новых школ. Па раёне будуецца 8 школ, а да новага навучальнага году будзе скончана толькі 2. Астатнія скончаны ня будуць з-за недахвату цьвікоў, цэменту і інш. матар'ялаў, а для мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў нічога ня робіцца. Аб такім становішчы ведае райвыканком, але мер ніякіх ня прымае.

Раён мае некаторыя дасягненьні ў падрыхтоўцы да навучальнага году, але гэтага мала. Трэба прыняць усе меры да таго, каб у «Дзень вучобы»—1 верасьня ўсе школы і ліквпункты пачалі работу ва ўсеўзброеньні.

А. Курдо.

Зрух ёсьць, але недастатковы

З прычыны таго, што Наркамфін скасаваў артыкул каштарысу на рамонт школ, **Бягомльскі** раён застаўся амаль бяз грошай на гэту мэту. Будаўніцтва новых школ ідзе чарапашымі крокамі.

Забесьпячэньне школ падручнікамі пакідае жадаць шмат лепшага. Да гэтага часу атрымана частка падручнікаў і тое толькі для II канцэнтру, падручнікаў для першага канцэнтру яшчэ зусім няма.

Для забесьпячэньня бяднейшых вучняў райінспэктарыят закупіў толькі... 200 пар абутку. Заказана абсталяваньне для арганізацыі гарачых сьнеданьняў. Пры дапамозе мясцовых камсамольскіх арганізацый праведзен масавы суботнік у фонд дапамогі школе.

Трэба напружыць усе сілы з тым, каб новы навучальны год сустрэць падрыхтаванымі.

Бараноўскі.

Не паслабляючы біць па вялікадзяржаўным шавінізьме

Барацьба за ленінскую нацпалітыку не пастаўлена ў цэнтр работы Лёзьненскай і Старадароскай партарганізацый

Не кампаніяй, а сыстэматычнай глыбокай работай па беларусізацыі змагацца за штодзённае ажыцьцяўленьне нацпалітыкі партыі

У Лёзьнянскім раёне не змагаюцца з вялікадзяржаўным шавінізмам

У час праверкі паштовага кіраўніцтва Лёзьнянішчыны, на чале якога стаяць камуністы Багданаў і Баранаў, высьветлілася, што ў апараце пошты зусім ня ўжываецца беларуская мова, работнікі не разбіраюцца ў пытаньнях нацыянальнай палітыкі партыі. Намесьнік загадчыка пошты Баранаў казаў: **«гэтая мова мала прышчапляецца таму, ведаеце, што сяляне да нас зварочваюцца па расійску».** Дырэктыва партыі аб карэнізацыі апарату, і асабліва пошты, ня выканана. На сёньняшні дзень у паштовых установах усяго раёну не працуе ніводнага яўрэя (і гэта пры значнай колькасьці яўрэйскага насельніцтва ў Лёзьнянскім раёне), а на запытаньне, чаму ў вас няма сярод служачых яўрэяў, Баранаў адказвае «аплата на пошце малая, таму яўрэі ня ідуць працаваць на пошту»—зразумела што гэта адказ заядлага антысэміта. Усё гэта яскрава сьведчыць аб скажэньні нацыянальнай палітыкі партыі ва ўстановах пошты,

Яшчэ горшае становішча, высьветлілася ў апараце райспажыўсаюзу, тэй арганізацыі, якая мае сувязь з шырокімі коламі насельніцтва. Амаль усе работнікі як адказныя, так і работнікі прылаўка ня ўжываюць беларускую мову. Некаторыя з іх кажуць, што «сяляне не размаўляюць па беларуску» (Гурэвіч, Далжанскі, Рысін, Ліўшыц, Баранаў, Чыжоўкін і г. д.). «Няма патрэбы ўжываць белмову, калі ніхто па беларуску не гаворыць». Пастанова партыі аб карэнізацыі апарату таксама ігнаруецца.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што пытаньням нацпалітыкі партыі ў Лёзьнянішчыне не надаецца належнай ўвагі, партыйныя ячэйкі: савецкая, каапэрацыйныя, нац. камісія РВК (якая дарэчы казаць увесь час спала) нічога сваячасова не рабілі. Не мабілізавалі масы на правядзеньне Ленінскай нацыянальнай палітыкі ва ўмовах Лёзьнянішчыны, з яе рознанацыянальным складам. Гэта трэба разглядаць як яркае праяўленьне правага апартунізму ў вырашэньні нацпалітыкі партыі. Уся партыйна-камсамольская арганізацыя раёну павінна, і зараз-жа, мабілізаваць усю партыйна-камсамольскую арганізацыю, калгасьнікаў, членаў прафсаюзаў, на правільнае ажыцьцяўленьне пастаноў партыі па нацпытаньні, накіраваўшы ўвесь бальшавіцкі агонь па вялікадзяржаўным шавінізьме як галоўнай небясьпецы на даным этапе.

Сем.

Беларусізацыя толькі для „фармальнасьці“

Праверка беларусізацыі Старадароскай пошты паказала, што гэтая важнейшая дырэктыва партыі ў галіне нацпалітыкі значнай часткай працаўнікоў ня выконваецца. Адносіны, розная перапіска вядзецца для «фармальнасьці» па беларуску, а фактычнае абслугоўваньне насельніцтва праводзіцца па расійску.

Вось факты. Тэлефаністка Гельфанд Рыва 9 месяцаў працуе на пошце; яна упарта не жадае вывучаць беларускую мову і карыстацца ёй на рабоце.

«У нас ўсе нацыі роўныя, а таму гутарыць можна на любой мове»,—так кажа працаўніца пошты Мальцава. Гурток арганізаваны брыгадай не працаваў, бо працаўнікі пошты не жадалі яго наведваць.

Беларуская мова ігнаруецца кіраўнікамі Жалескому, мэдпункту і большасьцю служачых розных саюзаў.

Патрэбна рашуча ўдарыць па вялікадзяржаўных шавіністах тыпу Малевічаў і Мальцавых і прымусіць вывучаць беларускую мову.

Партыйныя і камсамольскія ячэйкі павінны мабілізаваць масу на ажыцьцяўленьне ленінскай нацпалітыкі.

М. Ш.

Белмова ня ўжываецца

У канцылярыі Якаўлеўскага сельсавету Копыскага раёну ўсе дзелавыя паперы пішуцца на расійскай мове. Справавод сельсавету Лучкін усе даведкі піша выключна на расійскай мове.

Старшыня Сельсавету Антановіч на беларусізацыю свайго сельсавету не зварочвае ніякай увагі. Месячнік беларусізацыі, пастановы пленуму ЦК КП(б)Б па нацпытаньнях у Якавлевіцкім сельсавеце забыты зусім. Партыйная ячэйка РВК трэба ўзмацніць работы па правядзеньні ў жыцьцё нацыянальнай палітыкі і весьці рашучую барацьбу з усякімі праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму.

Л.

Ігнараваньне белмовы не сустракае рашучага адпору

Пастанова ЦК КП(б)Б аб генэральнай праверцы беларусізацыі не знайшла падтрыманьня з боку кіраўніцтва калгасу «Рухавік», Сяраскага сельсавету, Слуцкага раёну. Гэта пастанова ніколі і не разьбіралася. Ёсьць шмат працаўнікоў, якія белмовы ня ўжываюць, ігнаруюць яе, не атрымліваючы належнага адпору. Насьценгазэты цалкам у баку ад гэтага пытаньня.

Неабходна моцна ўдарыць па тых, хто ігнаруе белмову, хто справу беларусізацыі лічыць дробнай справай.

Брыгадэір «Сав. Бел.»

Алесь Шпакоўскі.

Зьняць з работы антысэміта

СЬМІЛАВІЧЫ. На пабудове шашы Менск—Магілеў занята шмат рабочых розных нацыянальнасьцяй. Але-ж сярод іх ніякая інтэрнацыянальная работа не вядзецца.

Аднойчы на рабочы, па нацыянальнасьці яўрэй, спазьніўся на работу, дык дзесятнік Шабанаў сустрэў яго такім выразам: «Ах жыд пракляты». Такія выразы часта заўважваюцца з боку Шабанава. Ён заўсёды абражае рабочых рознымі словамі. Апрача гэтага Шабанава амаль кожны дзень ўбачыш п'яным і лаячым рабочых.

Зразумела, такія зьявішчы не павінны мець месца сярод рабочых. Адміністрацыі 4-й дыстанцыі Дарбуду неабходна зараз-жа прыцягнуць да адказнасьці дзесятніка т. Шабанава заядлага антысэміта, якому не павінна быць месца сярод рабочых.

Даць адпор клясаваму ворагу

Праверка беларусізацыі ў Мазырскай каапэрацыйнай ячэйцы КП(б)Б высьвятліла пагражаючае становішча ў ячэйцы ў справе правядзеньня ленінскай нацпалітыкі партыі. Наяўнасьці пасьўнага супраціўленьня нацпалітыцы партыі нават з боку паасобных партыйцаў. Падамо лічбы: 68 проц. партыйцаў слаба або зусім ня ведаюць белмовы, ніводзін не знаём з беларускай літаратурай і гісторыяй Беларусі. 46 проц. партыйцаў слаба або зусім ня ведаюць асноў нацпалітыкі партыі, а 37 проц. толькі павярхоўна з імі знаёмы. У часе праверкі высьвятлен контр-рэвалюцыйны твар вялікадзяржаўнага шавініста з партбілетам у кішэні. Член партыі з 1926 году Віктар Дыканенка, працуючы старшынёй Рыбаксаюзу, зусім не знаёмы з белмовай і з асновамі нацпалітыкі партыі—заявіў, што белмовы ня ведае, не вывучаў і вывучаць ня будзе. Калі Дыканенку з Завочнага Камвузу прыслалі праграмы і навучальныя дапаможнікі на белмове—Дыканенка іх зьвярнуў з заявай аб тым, што па беларуску вучыцца ня будзе.

На паседжаньні бюро Дыканенка заявіў, што ён ня супроць нацпалітыкі партыі, але асабіста вывучаць белмовы ня будзе, што ў практычнай працы нацпалітыкі партыі не праводзіў і не будзе праводзіць, паколькі ён усё роўна з Беларусі паедзе».

Бюро парт'ячэйкі дало правільную палітычную ацэнку вылазцы клясавага ворага і пастанавіла Дыканенка з партыі выключыць і з работы зьняць.

Н. Мэрсон.

Клімавіцкая спажкаапэрацыя працуе па самацёку

Адозва ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб перабудове работы спажывецкай каапэрацыі клімавіцкімі каапэратарамі ігнаруецца. Ніякіх прызнакаў павароту спажыўсыстэмы да новых задач і новых мэтадаў работы не назіраецца. Як і раней «цэнтральнай фігурай» спажыўкаапэрацыі на тэрыторыі сельсавету Клімаўшчыны працягвае заставацца—крама.

Праўда ,арганізаваны Сельпо, але яны існуюць толькі на паперы. Крамаю «запраўляе» крамнік, як і раней, ніякага арганізацыйна-масавай работы вакол задач высунутых партыяй і ўрадам перад спажыўкаапэрацыяй не вядзецца, грамадзкі кантроль адсутнічае, праца ідзе самацёкам.

Такое становішча Клімавіцкай спажыўкаапэрацыі сьведчыць аб тым, што парт'ячэйкі і Клімавіцкі сельсавет работай каапэрацыі ня цікавяцца, адсюль гаспадарчы разрахунак у дзейнасьці Сельпо зьяўляецца справай выпадковай.

Мабілізацыя сродкаў насельніцтва, як па галіне паянжапленьняў так і па зборы будаўнічых сродкаў праходзіць апартуністычнымі тэмпамі і зусім ня забясьпечвае выкананьне плянавых заданьняў.

Скарачэньне выдаткаў не пастаўлена ў цэнтры ўвагі спажыўсыстэмы ў выніку большасьці Сельпо дыфіцітны. Спажывецкая каапэрацыя мае сваю прыгарадную гаспадарку і пры ёй малочную фэрму. Складаў для хаваньня няма. Збыт гародніны пайнікам яшчэ не арганізаваны. Малочная фэрма ня рэнтабельная. Сутачны ўдой ад 47 кароў—120 літраў малака. Ніякі ўдой тлумачыцца дрэнным даглядам кароў. Каровы стаяць у гарачыні. Вада ў карытах брудная. Для пабудовы кароўнікаў нават яшчэ не прыступілі.

Справа грамадзкага харчаваньня арганізавана дрэнна. Недахоп начыньня ў сталоўцы стварае чаргу. Пераважнага забясьпечаньня ўдарнікаў, а таксама вучоту іх няма. Крамная сетка Клімавіцкага райспажыўтаварыства вельмі грамозная, яна не адпавядае запатрабаваньням звароту тавараў.

Працаўнікі крам недастаткова пагражаны работай, у той-жа час маюцца залежы некаторых тавараў,як напрыклад лямпавага шкла на 100 р., яно ўжо ляжыць каля 5 месяцаў, бо няма лямпавых гарэлак.

У загатоўках каапэрацыйны акты удзелу ня прымае і гэта стварае пагрозу выкананьню плянавых заданняў. Падрыхтоўкай новых кадраў спажыўсыстэма не займаецца.

Гэтыя агідныя факты ўстаноўлены ў выніку абсьледваньня спажыўсыстэмы ў часе дэкадніка спэцыяльнымі брыгадамі арганізаванымі паводле дырэктыў РК з удзелам шырокай грамадзкасьці Клімаўшчыны.

В. Бальзоўскі.

Усё таварнае збожжа--у засекі дзяржавы

На 15-га жніўня па БССР выканана 24 проц. месячнага пляну збожжазагатовак. Менск, Бабруйск, Гомель, Магілеў, Віцебск і Жлобін не падрыхтавалі складаў для прыёмкі збожжа

Апэрацыйным кіраўніцтвам забясьпечыць выкананьне пляну збожжазагатовак

Праверыць падрыхтаванасьць да прыёмкі збожжа

Пытаньне падрыхтоўкі да прыёмкі збожжа мае вялікае значэньне. Аб гэтым ёсьць выразная пастанова ЦК УсеКП(б), якая абавязвае ня толькі загатоўчыя арганізацыі, але раённыя партыйныя і савецкія органы максымальна скарыстаць усе сілы на пасьпяховае правядзеньне збожжазагатоўчай кампаніі.

Між тым, факты сьведчаць, што тут ня ўсё добра. Склады Саюзхлеба па БССР належным чынам да прыёмкі збожжа не падрыхтаваны. Дэзынфэкцыя складаў, якая павінна быць даўно скончана, на мясцох ня зроблена. На загатоўчых пунктах не хапае інвэнтара (шуфляў, вядзёр, тачак, лапат і інш.), але захадаў да завозу нехапаючай колькасьці інвэнтара ніхто ня прымае.

Складзкой плошчы ў агульным па БССР ёсьць дастатковая колькасьць, але Бабруйск, Гомель, Магілеў, Віцебск і Жлобін патрэбнай складзкой плошчай не забясьпечаны. Да адшуканьня складаў там не прыступілі.

Па Менску частка складаў перададзена ў часовае карыстаньне розным установам, якія зараз, ня гледзячы на тое, што тэрмін для аслабаненьня даўно мінуў, не жадаюць аддаць складаў. Напрыклад, пошта катэгарычна адмаўляецца аслабаніць склады ёмасьцю на 500 тон.

Нідзе склады не забясьпечаны процівпажарным інвэнтаром. У Менску, у самым буйным складзе, дзе хаваюцца тысячы цэнтнераў збожжа, на тым-жа двары ляжыць сена і салома, што бязумоўна пагражае зьнішчэньнем ўсяго дабра ў выпадку пажару.

Забясьпечаньне збожжазагатовак тарай абстаіць выключна дрэнна. Па БССР не хапае каля 200 тыс. мяхоў. Між тым, гэтая колькасьць знаходзіцца ў запазычанасьці за рознымі ўстановамі. Апроч таго падлягае здачы ў Саюзхлеб загатоўчымі сыстэмамі каля 600 тыс. мяхоў, годных для ссыпаньня збожжа. Ня гледзячы на пастанову СНК аб звароце не пазьней 1-га жніўня ўсёй запазычанасьці па тары, асобныя ўстановы (Белкаапсаюз і інш.) гэтай дырэктывы ня выканалі.

Месячнік збору тары фактычна праваленны, бо на правядзеньне яго ня была мабілізавана грамадзкасьць. Саюзхлеб абмежаваўся толькі тым, што разаслаў пастанову Наркамснабу аб правядзеньні месячніка тары. Практычнай дапамогі і кіраўніцтва гэтай справай з боку Саюзхлеба ня было.

Сэктар складзіраваньня не наладзіў чоткага кіраўніцтва падрыхтоўкай да збожжазагатоўчай кампаніі. Замест практычнага кіраўніцтва пунктамі, ён у большасьці займаецца штампаваньнем. Ён пасылае цыркуляры аб падрыхтоўцы складаў усім пунктам, у тым ліку і няіснуючаму Менскаму пункту (збожжа ў Менску прымаецца непасрэдна канторай Саюзхлеба). Адказны выканаўца сэктару вестак аб наяўнасьці складзкой плошчы ня мае, ён накіроўвае па іх у сэктар вучоту. Вось гэтыя факты сьведчаць аб рабоце сэктару.

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб арганізацыі прыпісных кас ня выканана. Да гэтага часу няма плянаў, дзе арганізаваць прыпісныя касы.

Дагаворы з саўгасамі на здачу збожжа поўнасьцю не заключаны. Павінна быць заключана іх на 4.500 тон, а ёсьць ўсяго на 2.360 тон.

Пытаньне з рамонтам старых складаў і пабудовай новых абстаіць таксама нездавальняюча. Калі узяць, напрыклад, Жлобінскі пункт, дык той яшчэ нават не пачынаў будаўніцтва новага складу, які павінен быць закончан да 15-га жніўня. Наяўныя-ж склады зусім не прыстасаваны да прыёмкі збожжа: праз дзіравы дах цячэ вада, рамонту ніхто ня робіць. Работнікі Жлобінскага пункту ня прынялі захадаў да сваячасовай падрыхтоўкі складаў, а раённы камітэт партыі не прасачыў, як выконваецца пастанова ў гэтай галіне. Ён ня ўдарыў па апартуністах канторы Саюзхлеба, якія сваёй бязьдзейнасьцю, нежаданьнем выконваць дырэктывы партыі і ўраду, зрываюць збожжазагатоўчую кампанію.

Загадчык Жлобінскага пункту Саюзхлеба сазнаецца, што ў галіне бястарнай перавозкі збожжа ў іх нічога ня зроблена, быццам гэта ня іх справа.

Рэчыцкі пункт Саюзхлеба пытаньне аб бястарнай перавозцы збожжа таксама не прапрацаваў. Месячнікам тары там ніхто не займаўся і ён па Рэчыцкім раёне сарваны. За рознымі ўстановамі налічваецца запазычанасьць ў 2.000 мяхоў, для спагнаньня іх ніякіх захадаў ня ўжыта. Раённыя арганізацыі не праверылі становішча з тарай і ня ўдарылі па тых установах, якія зрываюць зварот тары.

Падрыхтоўка складаў да сваячасовай разгрузкі і нагрузкі вагонаў праходзіць зусім дрэнна. Да гэтага часу веткі для падвозу збожжа са складаў не падрыхтаваны. На аснове пастановы Савету Працы і Абароны веткі павінны будавацца чыгункай.

Мы патрабуем ад Жлобінскага райкому партыі тэрмінова зьмяніць кіраўніцтва Жлобінскага пункту Саюзхлеба, якое ня здолела сваячасова выканаць дырэктыў партыі.

Мы патрабуем ад Беларускай канторы Саюзхлеба чоткага практычнага кіраўніцтва сваёй нізоўкай, а не штампаваньня абежнікаў.

Раённыя арганізацыі павінны ўзяць пад суровы кантроль работу загатоўчых арганізацый. Грамадзкасьць павінна прыйсьці на дапамогу загатоўчым арганізацыям. Наркамснабу трэба зараз-жа праверыць, як падрыхтаваліся загатоўчыя арганізацыі да прыёму збожжа на мясцох.

Касьцяневіч і Аксёнчык.

На 15 жніўня

24 проц. месячнага пляну

Зараз-жа пераключыць увагу на збожжазагатоўкі

Талочынскі раён ня ўключыўся ў збожжазагатоўчую кампанію. Мясцовыя арганізацыі не абгаварылі гэтага пытаньня, а між тым уборка збожжа скончана і пачынаецца здача яго.

Пагражаючае становішча стварылася з падрыхтоўкай тары і складачных памяшканьняў.

Брыгада селькораў **Цукерман, Зэйгер, Арэшкаў.**

Ударыць па зрыўшчыках збожжазагатовак

Ельскія загатоўчыя арганізацыі яшчэ не падрыхтаваліся да збожжазагатовак. Вялікі склад у Ельску, які павінен быць гатовым да прыёмкі збожжа 5 жніўня, не адрамантаваны і да 12 жніўня. Хлеба ссыпаць няма куды. Дзесятнік Асенгаймэр вінаваціць у неадрамантаванасьці складу райкаапсаюз, які адмаўляе ў такой дробязі як наём каня для падвозкі матар'ялаў, каб рабочыя не цягалі на сваіх плячах ваду і цэмант.

На сёньняшні дзень склады не гатовы, дэзынфэкцыя не праведзена. Пастанова ўраду аб бальшавіцкай гатоўнасьці да прыёму збожжа па Ельскаму раёну асталася не выкананай.

Рабселькораўская брыгада: **Герасіменка, Шынкарчук, Якубоўскі.**

ЗВОДКА
аб ходзе ўборкі азіміны, ярыны і траў па БССР на 15 жніўня 1931 г.

	Азіміны ў проц.	Ярыны ў проц.	Лёну ў проц.	Канапель у проц.	Сенажаці ў проц.	Адпагад. траў у проц.
Па саўгасах . . .	95,8	14,4	4,5	24,5	78,6	16,5
„ калгасах . . .	98,8	24,9	25,0	2,8	91,4	28,4
„ аднаасобн. сэкт. . .	93,1	26,8	29,4	4,3	88,2	24,4
Разам па БССР .	94,6	25,9	27,3	4,4	89,1	24,7

Масавая перакідка настаўнікаў спынена

Вінаватых у ігнараваньні дырэктыў ЦК КП(б)Б—да адказнасьці

ЕЛЬСК (па тэлеграфе). Намечаная інспэктарыятам і саюзам працасьветы перакідка 48 настаўнікаў спынена. Для раёна не хапае 10 настаўнікаў. Звыш 50 проц. настаўнікаў на месца работы яшчэ не зьявілася. У інспэктарыят падана 15 заяў аб пераводзе ў іншыя раёны.

З васьмі будуемых школ будзе скончана толькі адна і то 1 кастрычніка. Абсталяваньня для школ няма. Згодна ўмовы, заказ на апошняе будзе выканан да... 1 красавіка 1932 г. На рамонт школ сродкаў па бюджэту няма і палова школ да рамонту ня прыступалі.

Фонд дапамогі вучням дзецям беднаты зусім ня выкарыстан, ня прыступлена і да яго выкарыстаньня.

Ліквпункты не працуюць, няпісьменных дапрызыўнікаў засталося 30 чалавек.

Сродкі, асыгнаваньня на набыцьцё падручнікаў і навучальных прылад, пайшлі на пакрыцьцё запазычанасьці за мінулы год. Ёсьць пагроза, што школы ня будуць забясьпечаны ў дастатковай колькасьці падручнікамі.

Мясцком працасьветы ўдзелу ў падрыхтоўцы да новага навучальнага году ня прымае.

Прарывы ў падрыхтоўцы да новага навучальнага году тлумачацца бязьдзейнасьцю інспэктарыяту нарасьветы і прэзыдыуму РВК.

Арганізаваны брыгады, якія выехалі ў сельсаветы для разгортваньня падрыхтоўкі да навучальнага году і мабілізацыі мас на ажыцьцяўленьне дырэктыў ЦК КП(б)Б.

Брыгада «Сав. Бел.», «ЗКП», НКА і ЦП Працасьветы
Захарын, Южык, Герасіменка.

Гомсельмаш УБОРАЧНЫЯ машыны

ГОМЕЛЬ. 15. За 14 жніўня сіласарэзачным цэхам выпушчана 30 сіласарэзак або 100 проц. выкананьня заданьня; сячкарань—6 штук, замест 15, бо дрэваапрацоўчы цэх ня даў драўляных рам. Бульбамыёк выпушчана 2 штукі—недавыкананьне з-за адсутнасьці дэталяй, бульбасартыровак—ніводнай; віноўнік гэтаму дрэваапрацоўчы цэх, які не дадаў драўляных станін.

14 жніўня зборачны цэх выпусьціў газэту «Штурмоўку», у якой пісалася, што брыгада па вырабу дыскаў мае прастоі з-за адсутнасьці падушак. Пры абсьледваньні высьвятлілася, што ў гэтым пытаньні акрамя разьмеркавальнага бюро значна ў чым вінавата адміністрацыя зборачнага цэху.

14 жніўня разьмеркавальнае бюро парашыла не загружаць ліцейны цэх вырабам падушак, бо на складзе лежала тысяча запасных штук падушак, якія мог-бы ачысьціць зборачны цэх, бо ў яго гуляла шмат брыгад з-за адсутнасьці работы, але адміністрацыя зборачнага цэху гэтага не зрабіла і як вынік брыгады зборачнага цэху прастаялі 1200 гадзін.

Яў. Р.

Пяць лёназаводаў пусьціць 20-га верасьня

На 10 жніўня вытворчыя карпусы пабудаваны толькі на 42 проц., іншыя памяшканьні—на 36 проц.

Райсаюзы, сельспажыўтаварыствы! Невыкананьнем дырэктыў партыі аб рабочым забесьпячэньні, вы зрываеце будаўніцтва лёназаводаў

Пусьціць да 20 верасьня 5 лёназаводаў

Паводле пастановы Галоўленкому СССР, лёназаводы, якія атрымліваюць імпартныя машыны (Швінг-турбіны) павінны быць пушчаны не пазьней 20-га верасьня г. г. У БССР да гэтай катэгорыі аднесена 5 заводаў: на Віцебскім вуч. 2 заводы—Вушацкі і Межанскі, па Аршанскім вуч.—2 заводы-Крупскі і Копыскі; і па Крычаўскім вуч.—1 завод — Чырвонапольскі.

Беллёнаканоплеводбуд даў дырэктыву начальнікам вучасткаў аб узмацненьні і фарсаваньні гэтага звышударнага будаўніцтва. На 10-га жніўня мы маем такі малюнак выкананьня па гэтых заводах: па Вушацкім—вытворчы корпус выкананы на 57 проц. будаўніцтва, іншае будаўніцтва на 39 проц. На Межанскім — вытворчы корпус 55 проц., інш. будаўніцтва—46 проц. На Крупскім — вытворчы корпус 85 пр., інш. 71 проц. На Копыскім—вытворчы корпус 55 проц., інш. будаўніцтва—49 проц. па Чырвонапольскім вытворчы корпус—71 проц. інш. будаўніцтва 60 проц.

Чатыры заводы — Крупскі, Копыскі, Межанскі і Чырвонапольскі атрымалі ўсе машыны поўнасьцю за выключэньнем трансмісій, якія гэтымі днямі высылаюцца непасрэдна з Масквы. Лёнаканоплебудам накіраваны на вучасткі спэцыялісты для ўстаноўкі і мантажу пасланых частак мантажнага струмэнту. Нач. вучасткаў і заг. будаўніцтва павінны прыняць рашучыя захады, каб забясьпечыць мантажныя работы патрэбнымі матар'ялам: цэглай, жалезам, цэмантам і г. д.

Райвыканкомы павінны ўзяць пад асобны кантроль будаўніцтва лёназаводаў і дапамагчы ў тэрмін закончыць іх. Тэрмінова павінна быць накіравана на будаўніцтва неабходная колькасьць рабочай сілы, майстраў розных катэгорый.

Трэба стварыць вакол гэтага звышударнага будаўніцтва масавасьць, нала дзіць прафэсыянальную работу, разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва з выклікам аднаго заводу другім за сваячасовы пуск іх.

Ад бальшавіцкіх тэмпаў работы залежыць пуск 5 лёназаводаў да 20 верасьня

Ермонін.

Дапамагчы закончыць Зарубскі лёназавод

Дуброўна. (Наш. спэцкор). На будаўніцтве Зарубскага лёназаводу — значны прарыў. Галоўны корпус зроблены на 60 проц. Дапаможныя пабудовы на ват не пачаты. Прарыў ускладняецца яшчэ тым, што ўсе будматар'ялы трэба завозіць на адлегласьці 20-30 кілёмэтраў. Гэта ў значнай ступені ўскладняе будаўніцтва. Заводу патрэбна перавезьці некалькі дзясяткаў тысяч цэглы.

Трэба мабілізаваць грамадзкую думку вакол хутчэйшага падвозу будаўнічых матар'ялаў. Зарубскі калгас настаўніў аказаць садзейнічаньне будаўніцтву. Калгас выклікаў на сацспаборніцтва іншыя калгасы і сельсаветы: Бусукі, Сватошыцкі, Цылевіцкі па аказаньні грамадзкай дапамогі ў перавозцы будаўнічых матар'ялаў Зарубскаму лёназаводу.

Макарэвіч.

Адвесьці пагрозу зрыву будаўніцтва Багушэўскага лёназаводу

Будаўніцтва Багушэўскага лёназаводу (Аршаншчына) адносіцца да першачартовых. Ня гледзячы на гэта яно выканана толькі на 60 проц. Пабудова галоўнага корпусу выканана толькі на 15 проц., у той час як ён павінен быў ужо быць гатовы.

Такія марудныя тэмпы будаўніцтва Багушэўскага лёназаводу тлумачацца тым, што будаўніцтва ня было поўнасьцю забясьпечана патрэбнымі будаўнічымі матар'ялам: жалезам, цьвікамі, гонтамі і г. д. На працягу паўтара месяца будаўніцтва было зусім спынена толькі таму, што нехапала цьвікоў, скабянога жалеза і балтоў. Рабочыя былі распушчаны. Будаўніцтва пачалося толькі нядаўна. Праўда, па будаўніцтве было палоснае жалеза з якога можна было-б зрабіць 300 абвязьцілі сябе ўдарнікамі на хутчэйшае сканчэньне заводу, але трэба сказаць, што адсутнасьць увагі заводу з боку мясцовых арганізацый і дрэннае снабжэньне рабочых, не даюць магчымасьці разгарнуць работу як належыць і паставіць яе на ўдарныя тэмпы.

Будаўніцтва Лёназаводу на Аршаншчыне.

Трэба таксама адзначыць, што будаўніцтва лёназаводу ўвесь час ідзе бяз тэхнічнага нагляду. Начальнік Віцебскай канторы Лёнаканаплеводбуду быў толькі адзін раз на пабудове, а тэхнікаў тут і ў вочы ня бачылі.

Рабочай сілы на будаўніцтве ёсьць дастаткова. Рабочыя і адміністрацыя скоб, але дырэктар лёназаводу Годзе не згадзіўся гэта рабіць.

Трэба ўзмацніць кантроль над будаўніцтвам Багушэўскага лёназаводу і дапамагчы ў тэрмінам закончыць іх. Тэрмінова павінна быць накіравана на будаўніцтва неабходная колькасьць рабочай сілы, майстраў розных катэгорый.

Трэба стварыць вакол гэтага звышударнага будаўніцтва масавасьць, нала дзіць прафэсыянальную работу, разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва з выклікам аднаго заводу другім за сваячасовы пуск іх.

Ад бальшавіцкіх тэмпаў работы залежыць пуск 5 лёназаводаў да 20 верасьня

Ермонін.

У бой за паперу

Забясьпечыць „Спартак" сыравінай

Адсутнасьць макулатуры пагражае спыненьнем фабрыкі. Рамонт дызеля № 2 злачынна зацягваецца

Рабочыя прынялі прапанову брыгады „Сав. Бел."—скончыць рамонт дызеля на працягу 8 дзён

Сэрца фабрыкі хварэе

За 15 жніўня фабрыка «Спартак» выпрацавала 30,48 тон паперы, што складае 77,36 проц. пляну. Брыгада Карчагіна выканала плян на 110 проц., брыгада сетачніка Манцэвіча—на 129,6 проц.

Зьдзіўляе няроўнамернасьць у крывой выкананьня пляну. Бывалі дні, калі прамфінплян даходзіў да 100 проц. выкананьня. Гэта дні, калі падача энэргіі пары ішла бесьперабойна і склад брыгадзіраў-сетачнікаў быў найбольш здавальняючым.

У «Савецкай Беларусі» ужо ня раз пісалася, што да атрыманьня матораў, для прыёму дадатковага току з Белдзэсу— увесь цэнтр цяжкасьці пераносіцца на работу ўласных фабрычных дызеляў.

Цяпер фабрыка абслугоўваецца адным дызелем, які амаль што штодня спыняецца на бягучы рамонт. Так ў апені месяцы, дзякуючы адсутнасьці энэргіі паперамашыны прастаялі каля 300 гадзін і прамфінплян таму і быў выканан усяго толькі на 67,8%.

Другі дызель ужо 2 месяцы стаіць на рамонце. У адносінах да гэтага дызеля, які мог-бы забясьпечыць бесьперабойную падачу энэргіі, а значыцца і 100 проц. выкананьня пляну, праяўлена злачынная безгаспадарчасьць.

Яшчэ ў кастрычніку месяцы 30 году гаварылася і пісалася аб неабходнасьці паставіць машыну на капітальны рамонт, з прычыны яе зношанасьці. Няўважнасьць да гэтага пытаньня прывяла да таго, што толькі ў 31 годзе і то ў другую палову, калі вырашаецца лёс пляну трэцяга рашаючага году пачалі рамонтныя работы.

Толькі цяпер усе работы па зборцы рамонтуемага дызелю зданы брыгадзе на аснове зьдзелшчыны. Аднак яшчэ і цяпер брыгада рамонту фактычна не працуе.

Вось факты: 15-8 са складу 11 чал. працавалі ўсяго трое. 16-8 з брыгады ніхто не працаваў, матывуючы тым, што ў дызельнай ёсьць скразьнякі... З 28-7 наогул амаль ня было работы па рамонту.

Заг. парасілавай гаспадаркай т. Дучкоў не адважваецца сам праводзіць расцэнак, а галоўны мэханік тав. Рыты ня даў перад ад'ездам у Маскву адпаведных распараджэньняў. У гэтым пытаньні выяўлена тая шкодная «абязьлічка» якая зьядае як іржа нашы вытворчыя посьпехі. Дучкоў спасылаецца на Лукомскага. Усе спасылаюцца на Рытца. Дырэктар тав. Алексеєў яшчэ ня ўзяў пад свой нагляд гэтага вучастку работы.

Другой зьмены сьлесароў і токароў у мэханічнай майстэрні не ўстаноўлена. Рабочыя заяўляюць, што рамонт дызеля мог быць даўно закончан калі-б «гаспадарнік» загадаў.

Вытворчы аддзел (паперовыя машыны), які павінен быў настойліва патрабаваць сваячасовага сканчэньня работ дызеля, не праявіў настойлівасьці ў прадаўленьні контр-прэтэнзій мэханічнаму аддзелу.

У пытаньні аб рабоце капітальнага рэмонту рухавіка парткалектыў і фабком ня вывялі ніякай ініцыятывы. Работа ішла самацёкам, без мабілізацыі грамадзкасьці да гэтага пытаньня.

Брыгада «Савецкай Беларусі» ставіць пытаньне перад тэхнічнай нарадай і рабочымі мэханічнай аб сканчэньні рамонту рухавіка на працягу 8 дзён.

Рабочыя па прапанове нашай брыгады выказалі гатоўнасьць заключыць сацыялістычны дагавор на шпаркае і якаснае выкананьне работ.

Вельмі важным пытаньнем для вытворчасьці зьяўляецца пытаньне аб вывучэньні прастояў папяровых машын дзякуючы зьмене вопраткі і рамонту. За ліпень месяц паводле нашых падлікаў па розных прычынах машыны прастаялі каля 204 гадзін. (апроч паказаных прастояў дызеля).

Зусім дрэнна працуе плянавы аддзел, калькуляцыя і статыстыка, якія ня могуць даць поўнага малюнку вытворчасьці.

Брыгада «С. Б.»—Гарын, Аўге.

„Спартак" пад пагрозай спыненьня

Чакаем адказу Белпапераб'яднаньня

На адрас радакцыі газэты «Савецкая Беларусь» атрымана наступная тэлеграма:

«З-за адсутнасьці макулатуры фабрыцы «Спартак» пагражае спыненьне. Узьдзейнічайце на Бумснаб—Масква. Брыгада «С. Б.», Гарын, Аляксеєў».

Рэдакцыя «Савецкая Беларусь» лічыць, што Белпапераб'яднаньне павінна ў тэрмінова прыняць усе захады датаго, каб не дапусьціць спыненьня фабрыкі. Аб прынятых мерапрыемствах рэдакцыя чакае ад Белпапераб'яднаньня тэрміновага адказу.

Апартуністы топяць лёназавод у моры аб'ектыўных умоў

АСЬВЕЯ. (Белта). Надзвычай марудным тэмпамі праходзіць будаўніцтва Асьвейскага лёназаводу. Будаўніцтва заводу пачалося толькі ў бягучым месяцы. Будматар'ялы будаўніцтва не забясьпечана поўнасьцю. 4 жніўня спынілася пабудова сілавой станцыі з прычыны недастаўкі цэглы. Не арганізавана падвозка жэрдак дошчак і круглага лесу. Ударніцтва і сацспаборніцтва як сьлед не разгорнута. Рабочай сілай будаўніцтва поўнасьцю не забясьпечана.

Рабочае забясьпячэньне з боку каапэрацыі наладжана зусім дрэнна. Райвыканком і партыйныя арганізацыі зусім мала клапоцяцца аб будаўніцтве лёназаводу.

Асеньня-зімнія перавозкі

Сыгналы „Савецкай Беларусі" не пачуты

На Менскім вузьле таварныя пробкі затрымліваюць грузазваротт. Неадкладна ліквідаваць таварныя заторы

Ліквідаваць пробкі па Менскім вузьле

З 3-га жніўня на Менскім чыгуначным вузьле стварылася пробка. Скапілася больш 200 вагонаў рознага грузу. Вагонаў падаваць больш няма куды. Усе пакгаўзы завалены грузамі, якія ляжаць больш як па месяцы і ня вывозяцца.

3-га недахвату рабсілы, пакгаўзаў, пляцовак, хавальнікаў гароднінны і складаў, прыбыўшыя вагоны ня гледзячы на пробку неразгружаюцца.

Сутачны грузапаток перавышае 200 вагонаў. Адміністрацыя чыгуначнага Менскага вузла да асеньня-зімовых перавозак падрыхтоўкі не вяла і ня дзіва, што пры сустрэчы першага грузапатоку асеньня-зімовых перавозак стварылася пробка. Адсюль і асеньня-зімовыя перавозкі сталі пад пагрозу зрыву.

Ня гледзячы на сыгналы газэты «Савецкай Беларусі» ніякія меры ня прымаюцца. Партыйныя, камсамольскія і прафарганізацыі і адміністрацыя пасьпяха адносяцца да гэтага пытаньня.

Ня гледзячы на тое, што клієнтура зрывала і зараз зрывае асеньня-зімовыя перавозкі, Менскі вузел зусім не падрыхтоўвае ні складаў, ні хавальнікаў гароднінны, ні памяшканьня і ідзе супроць мэханізацыі пагрузачна-выгрузачных работ, парушаючы гэтым пастановы партыі і ўраду.

Пастанова ЦК УсеКП(б) і пятага пленуму ЦК КП(б)Б па пытаньні асеньня-зімовых перавозак, Менскім чыгуначным вузлом і такімі арганізацыямі як Белкаапсаюз,МЦРК, Прадмат Саюзхлеб, Саюзлес, Садгароднінна, ня выконваецца.

Клієнтура таксама сабатуе дырэктывы партыі ў адносінах мэханізацыі і падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак.

Менскія гарадзкія арганізацыі як партыйныя, так і прафсаюзныя ніякіх мер да ліквідацыі стварыўшагася становішча з клієнтурай на вузле ня прымаюць. Кантролю праверкі падрыхтоўкі да асеньніх няма.

Грамадзкасьць вузла і гораду не ўзьнята на ліквідацыю пробкі.

Неабходна тэрмінова мабілізаваць грамадзкасьць, друк, арганізаваць суботнікі па выгрузцы, разьбіць усякі апартунізм, нядбайнасьць і шкодніцкія адносіны клієнтуры да транспарту.

Сыгналы друку як мясцовага, так і цэнтральнага, вузлавымі арганізацыямі і клієнтурай і гарадзкімі ўстановамі праігнараваны работу не пачуты. Неабходна ліквідуючы пробку, прыцягнуць вінаватых да самай суровай адказнасьці.

Трэці раён ведаючы становішча загатоўкі па Менскім вузле да асеньня-зімовых перавозак дапамогі не аказаў. Дырэкцыі МББ чыгункі неабходна зьвярнуць асаблівую ўвагу на пробку Менскага вузла, якая пагражае зрывам асеньне-зімовых перавозак.

Мельнікаў.

Бабруйская прыстань да асеньня-зімовых перавозак не гатова

На сёньняшні дзень Бабруйская прыстань яшчэ ня мае канкрэтнага пляну разгортваньня асеньня-зімовых перавозак. Плян перавозак на жнівень месяц з кіраўніцтва Дняпра-Дзьвінскага басэйну прыслан толькі 8 жніўня, прычым выкананьне гэтага пляну ідзе надзвычайна марудным тэмпамі. Такія клієнты, як напрыклад Саюзхлеб, Лесбел, Саюзпрамкорм, на долю якіх прыпадаюць асноўныя перавозкі на жнівень месяц, да гэтаго часу далі для перавозкі толькі зусім незначную колькасьць грузаў.

З боку кіраўніцтва прыстаньню не праяўлена належнай настойлівасьці ў заключэньні дагавароў і атрыманьні заявак ад клієнтаў. Праўда, для гэтай мэты была складзена брыгада, але гэтая брыгада не дала належных вынікаў. Амаль ніводная ўстанова і арганізацыя заявак на перавозкі не дала. У прысланым з кіраўніцтва пляне перавозак на жнівень зусім адсутнічаюць такія арганізацыі як Саюзхлеб, мець перавозкі.

Што да падрыхтаванасьці самой Цэрабкоп, якія бязумоўна, будуць адзначыць, што тут справа абстаіць таксама ня зусім добра. Вярбсўка рабочай сілы не праводзіцца. Згодна пляну кіраўніцтва павінна быць завербавана да 200 рабочых. На сёньняшні дзень ёсьць толькі 68, прычым ад вярбоўкі большай колькасьці рабочых кіраўнікі прыстані ўстрымліваюцца, ня маючы рэальных плянаў перавозкі.

Рабочае забясьпячэньне, якое павінна быць пастаўлена на належную вышыню, асабліва ў такі адказны пэрыяд часу, як асеньня-зімовыя перавозкі, пастаўлена зусім кепска. Праўленьне вседнага спажывецкага таварыства не перабудавала сваёй работы, не скарыстоўвае тых магчымасьцей, якія маюцца для наладжваньня забясьпячэньня. Сталоўка працуе з перабоямі, маюцца выпадкі пратэкцыянізму ў рабоце спажыўтаварыства.

Вучастковы ўпаўнаважаны па забясьпячэньні Гарэлік працуе кепска, ня цікавіцца зусім работай, не адпавядае свайму прызначэньню.

Гаспадарчыя арганізацыі і мясцком воднікаў ніякіх практычных вынікаў не зрабілі з прамовы тав. Сталіна, ня гледзячы на тое, што гэтая прамова як быццам прапрацоўвалася і на партыйных і на агульных сходах рабочых. У зарплаце пануе ўраўнілаўка.

Гаспадарчы разьлік не знайшоў да гэтага часу яшчэ практычнага ажыцьцяўленьня тут. Праўда, як быццам на яго пераведзены чатыры судны, але ніякіх практычных вынікаў гэтага перавозу няма. Пытаньне аб перавозе на гаспадарчы разьлік сярод масы рабочых прапрацавана зусім недастаткова. Самі кіраўнікі прыстані мяркуюць атрымаць практычныя вынікі ад перавозу на гаспадарчы разьлік «толькі праз некалькі месяцаў».

Мясцком не павярнуўся тварам да вытворчасьці ў сваёй рабоце, не разгарнуў шырокай растлумачальнай работы.

Бабруйскай прыстані павінен быць даны ў бліжэйшыя дні плян перавозак на ўвесь асеньні пэрыяд. Аб гэтым павінна патурбавацца і сама прыстань і кіраўніцтва Дн.-Дзьв. басэйну. Бяз гэтага немагчыма чоткая і арганізацыйная работа.

Рашучым чынам павінна быць палепшана забясьпячэньне, культработа. Прыстань павінна быць забясьпечана рабсілай. Апартуністычнаму спасыланьню на «аб'ектыўныя прычыны» павінен быць дадзены рашучы бальшавіцкі адпор.

Брыгада «Савецкай Беларусі»:
А. Дамброўскі,
Я. Рабкін,
Л. Ламаносаў.

Рэйд аб'яднанай брыгады газэт: „Чырвонаармейскай Праўды", „Савецкай Беларусі", „Чырвонай Зьмены"

Падрыхтоўка да прызыву ў РСЧА—у асяродак увагі!

Віцебскі і Талочынскі раёны павінны безадкладна навярстаць упушчанае

Больш клясавай старожкасьці

ТАЛОЧЫН. Становішча з падрыхтоўчай работай да прызыву 1909 году нараджэньня па раёне вымушае біць трывогу.

Дзякуючы праваапартуністычнай не даацэнцы пытаньня прызыву «3-га рашаючага» з боку партыйных, камсамольскіх і ўсіх грамадзкіх арганізацый на мясцох і некаторых раённых (РВК, Райпрафсавет, Райкалгасаюз, Спажыўсаюз), падрыхтоўчая кампанія знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Ня гледзячы на неаднаразовыя дырэктывы, РК КП(б)Б і Райваенкамату, да гэтага часу РВК не закончыў работу па выяўленьні і адсеву клясавачужых элементаў.

Некаторыя сельсаветы да выяўленьня клясава-чужых элементаў адносяцца самі бяз клясавай чуласьці. Так, адзін сельсавет сыну былога папа выдаў характарыстыку, што ён можа быць у радох РСЧА. Рад сельсаветаў да выдачы характарыстык дапрызыўнікам адносіцца фармальна. У такіх характарыстыках зусім няма клясавага твару таго ці іншага прызыўніка.

На раёне ліквідацыя няпісьменнасьці і малапісьменнасьці сярод дапрызыўнікоў не праводзіцца, нават няма вучоту няпісьменных і малапісьменных прызыўнікоў. Райінспэктар Нарасьветы ня прыняў ніякіх захадаў да арганізацыі лікпунктаў і школ малапісьменных.

Культурна агітмасавай, выхаваўчай работы сярод прызыўнікоў не праводзіцца.

Хаты-чытальні, нардамы не павярнуліся тварам да абслугоўваньня прызыву. У большасьці нардомаў, хаты-чытальняў няма вайсковай літаратуры, а дзе яна і ёсьць, яе закідваюць у куткі і ніхто не клапоціцца аб прасоўваньні яе ў гушчы прызыўнікоў.

Аб'яднаны пленум РКК і РК КП(б)Б, які адбыўся 12 жніўня катэгарычна прапанаваў усім раённым і мясцовым арганізацыям забясьпечыць поўнае і пасыляховае правядзеньне ўсёй работы па прызыву.

Але гэтыя дырэктывы да гэтага часу як раённыя, так і мясцовыя арганізацыі недастаткова праводзяць у жыцьцё. Карэннага пералому ў рабоце па падрыхтоўцы да прызыву няма.

Брыгада газэт «Чырвонаармейская Праўды», Савецкай Беларусі», «Чырвонай Зьмены», рэйду «Красной Звезды» разам з Райкомам КП(б)Б і РК ЛКСМБ і раённай газэтай «Калгаснік Талочыншчыны» арганізавалі расселькораў і раённы актыў і выехалі па сельсаветах, калгасах, саўгасах і вёсках для ліквідацыі маючыхся прарываў у падрыхтоўцы да прызыву.

Брыгада друку:**Паўлюкевіч («Чырвонаарм. Праўда»),**
Боська («Сав. Бел.»),
Лукашук («Чырв. Зьмена»).

Віцебск пачаў падрыхтоўку

ВІЦЕБСК. (Наш. кар.). Віцебскі гарком партыі заслухаў інфармацыю аб становішчы ходу правядзеньня чарговага прызыву ў РСЧА 1909 году нараджэньня.

Сакратарыят гаркому прапанаваў усім калектывам і ячэйкам КП(б)Б, фракцыям ФЗМК пад іх асабістую адказнасьць да 20 жніўня скончыць запаўненьне анкет прызыўнікоў і правесьці на прадпрыемствах канфэрэнцыі прызыўнікоў. Фракцыі гарсавету прапанована стварыць сталую камісію па падрыхтоўцы і правядзеньні прызыву.

За дрэнную работу па падрыхтоўцы да прызыву папярэджаны адказныя сакратары парткалектываў «Чырвоны мэталіст», чыгункі, «Сьцяг індустрыялізацыі і «Дзьвіна».

Н. Дварсон.

Пазыку „3-ці рашаючы"—у масы

У БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ

ЛІКВІДАВАЦЬ ПРАРЫЎ У РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ

Лоеўскі раён толькі на 5,7 проц. выканаў заданьне сярод вясковага насельніцтва. Усю сілу грамадзкасьці на ліквідацыю прарываў

Спажыўкаапэрацыя і Трактарацэнтр слаба ўдзельнічаюць у мабілізацыі сродкаў насельніцтва

16 жніўня пры Наркамфіне БССР адбылася нарада з прадстаўнікоў: Наркамфіну, Калгасцэнтру, Сельгаснабу, Трактарацэнтру, Наркамзему, і Дзяржбанку, па пытаньні ходу мабілізацыі сродкаў насельніцтва ў трэцім квартале трэцяга рашаючага году.

Нарада адзначыла зусім нездавальняючае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў насельніцтва, асабліва ў частцы паяжакапленьня па спажывецкай каапэрацыі, рэалізацыі акцый Трактарацэнтру і абавязацельстваў на сельска-гаспадарчыя машыны.

Ня гледзячы на дырэктывы ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б, па мабілізацыі сродкаў па вышэй адзначаных галінах да апошняга часу зварочаецца зусім малая ўвага як з боку мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый, так і з боку цэнтральных органаў (НКЗем, Белсельгаснаб, Трактарацэнтр, Дзяржбанк, Белкаапсаюз і сыстэма сельска-гаспадарчай каапэрацыі).

Выходзячы з гэтага парада пастанавіла:

1. Улічваючы, што далейшы зрыў выкананьня пляну мабілізацыі сродкаў па паяжакапленьні, рэалізацыі акцый Трактарацэнтру і абавязацельстваў на сельска-гаспадарчыя машыны, пацягне за сабою скарачэньне завозаў у БССР тавараў, трактараў і сельска-гаспадарчых машын, лічыць неабходным каб па лініі БКС, Трактарацэнтру і сыстэме сельска-гаспадарчай каапэрацыі—былі прыняты безадкладныя рашучыя меры для ліквідацыі дапушчанага прарыву. У прыватнасьці прызнаць зусім неабходным дапасаваньне мер эканамічнага і фінансавага ўзьдзеяньня ў адносінах адстаючых раёнаў і арганізацый—шляхам скарачэньня завозу тавараў у раёны, ня выконваючыя пляну паяжакапленьня, урэзкі, або поўнай затрымкі крэдытаў і лімітаў, шырока інфармуючы аб гэтых мерах праз друк, з паказаньнем вінаватых у зрыве пляну мабілізацыі сродкаў.

2. Прапанаваць Белканторы Дзяржбанку ўстанавіць самы жорсткі кантроль рублём у адносінах арганізацый, якія ня выконваюць сваіх плянаў па мабілізацыі сродкаў.

3. Зьвярнуцца праз СНК БССР з спэцыяльным лістом да райвыканкомаў з паказаньнямі аб безадкладным узмацненьні работы па паяжакапленьні па лініі каапэрацыі, па распаўсюджваньні акцый Трактарацэнтру і абавязацельстваў на сельска-гаспадарчыя машыны.

4. Прасіць кіраўніцтва Калгасцэнтру зьвяртаецца з лістом да калгасаў і калгасыніка аб актыўным удзеле калгаснай сыстэмы ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў па ўсіх галінах.

5. Зьвярнуцца да Наркамзему з прапановай даць паказаньні па лініі ўстаноў сельска-гаспадарчай каапэрацыі (Лёнаканаплеводстру, Садсаюзу, Белмалжыўсаюзу), аб тым, каб гэтыя арганізацыі актывізавалі сваю работу ў частцы мабілізацыі сродкаў.

6. Канстатуючы, што ў галіне таваразвароту да апошняга часу назіраюцца недапушчальныя зьявішчы затаварваньня, няправільнай засылкі тавараў, прымусовага асартымэнту—зьвярнуцца да Наркамснабу і Белкаапсаюзу з прапановай аб дачы паказаньняў наконт арганізацыі правіл нага таваразвароту ў раёнах.

7. Прасіць агіт-масавы аддзел ЦК КП(б)Б зрабіць масавую праверку выкананьня пастановы пленуму ЦК КП(б)Б аб мабілізацыі сродкаў.

8. Прапанаваць Дзяржбанку ўстанавіць такі парадак вучоту паступленьняў па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру і абавязацельстваў на сельска-гаспадарчыя машыны, які-б забясьпечыў выдзяленьне сельскагаспадарчых сэктароў: калгасаў, каапэрацыйнай сыстэмы і аднаасобнікаў.

9. Прасіць Цэнтральную камісію садзейнічаньня Дзяржкрэдыту і апошняй справы пры ЦВК БССР—узяць на сябе функцыі садзейнічаньня такога крэдыту, як рэгулюраньне акцый Трактарацэнтру і абавязацельстваў Сельгаснабу.

10. Лічыць ненармальным, што, ня гледзячы на неаднаразовыя просьбы як пісьмовыя, так і па тэлефоне, прадстаўнік Белкаапсаюзу на нараду не зьявіўся, аб чым паведаміць тав. Хаскіна і прасіць яго паведаміць прычыны гэтай няяўкі.

Забясьпечыць поўнае выкананьне фінпляну

УСІМ ГАРФА І РАЙФА

Улічваючы надзвычайна адказныя задачы, якія пастаўлены перад фінансава-крэдытнай сыстэмай па выкананьні фінпляну асабліва 3-га кварталу 3-га рашаючага году пяцігодкі, для рэгулярнага і поўнага забясьпячэньня сацыялістычнага будаўніцтва, другі чарговы Пленум Фінбанкаўскіх работнікаў мабілізуецца в 20 жніўня на дэкадны тэрмін для дапамогі раёнам па мабілізацыі сродкаў.

Прапаную пад асабістую адказнасьць загадчыкам Гарфа і Райфа аказаць максымальную дапамогу пасыланым таварышом і разам з імі забясьпечыць пералом у працы для поўнага выкананьня фінпляну.

Хацкевіч.

Дэзэртыры фінансавага фронту прыцягваюцца да адказнасьці

Загад № 96

па Народнаму Камісарыяту Фінансаў БССР ад 17 жніўня 1931 г. гор. Менск

Прызначаныя пасьля ліквідацыі раёнаў, а таксама ў парадку перакідкі загадчыкі Копыльскага Райфа тав. Завін, Чарэйскага—тав. Прыбышаў, Юравіцкага—тав. Мельчанка, дагэтуль у прызначаныя раёны не зьявіліся, што яшчэ больш паглыбіла прарыў па выкананьні фінпляну гэтых раёнаў. За невыезд сваячасова на працу па новым прызначэньні, за дэзэртырства ў час напружанай фінансавай работы—абвясьціць т. т. Завіну, Прыбышаву і Мельчанку суровую вымову з аслабаненьнем іх ад новага прызначэньня загадчыкаў Райфа і назначэньнем на пасады інспэктароў.

Раіць загадчыкамі Райфа, з ліку канчаючых Цэнтральныя Фінансавыя курсы пры НКФ БССР, у Вушацкі раён—тав. Сянькевіча, Кармянскі раён—тав. Анісковіча і ў Бярэзінскі—тав. Шкляра.

Народны Камісар Фінансаў БССР
Хацкевіч.

На дапамогу выкананьню фінпляну

УСІМ МК РМК САЮЗУ ФІНАНСАВА-БАНКАЎСКІХ РАБОТНІКАЎ.

Другі чарговы Пленум Фінбанкаўскіх работнікаў улічваючы надзвычай важныя задачы, якія пастаўлены перад Фінансава-крэдытнай сыстэмай па выкананьні фінпляну асабліва 3-га кварталу 3-га рашаючага году пяцігодкі, які павінен забясьпечыць выкананьне пляну сацыялістычнага будаўніцтва, сьпіняе сваю работу на 10 дзён для выезду ў раёны БССР па выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў.

Пленум абавязвае ўсіх МК і РМК Саюзу фінбанкаўскіх работнікаў перакінуць сваю работу мабілізуючы ўвагу членаў п.-саюзу і ўсіх працаўнікоў на выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў, забясьпечыўшы арганізацыйнымі мерапрыемствамі 100 проц. выкананьне заданьняў па мабілізацыі сродкаў 3-га кварталу 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Старшыня ЦП Саюзу ФБР
Кайкоў.

Лоеўскі раён правальвае рэалізацыю пазыкі ў вёсцы

Заданьне па рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы» па Лоеўскім раёне складае 222 тысячы рублёў, з якіх сярод рабочых і служачых патрэбна рэалізаваць 44.000 тыс. руб.; калгасьнікаў і аднаасобнікаў 138 тыс. і інш. 20 тыс. руб.

РВК, улічыўшы магчымасьці рэалізацыі пазыкі, высунуў сустрэчны плян у 250 тыс. руб.: сярод рабочых, служачых і самагужнікаў распаўсюдзіць 75 тыс. руб. і сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў—175 тыс. руб.

Зараз, паводле пляну Наркамфіну ў 44 тыс. руб., сярод рабочых і служачых рэалізавана пазыкі на 49 тыс. р., што складае 111,3 проц. выкананьня пляну. Сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў паводле пляну трэба рэалізаваць 158 тыс., а рэалізавана сярод калгасьнікаў 6 тыс. руб.; а сярод аднаасобнікаў 3 тыс. руб., што складае 5,7 проц. выкананьня заданьня.

Рэалізацыя пазыкі на вёсцы ў калгасах Лоеўскага раёну праходзіць вельмі марудным тэмпамі. Па радзе калгасаў і сельсаветаў няма ніякай работы па падпісцы. На 16-VII—чыволна з калгасьніка і аднаасобніка ня было ахоплена падпіскай.

Па Лоеўскім сельсавеце на 25-VII рэалізавана пазыкі на 15 руб. Сельсаветы і камсоды з-за адсутнасьці кіраўніцтва бязьдзейнічаюць. Старшыня Ўборкаўскага сельсавету Сычаў кажа:

«У нас пяпер уборачная, няма калі вазіцца з пазыкай».

Рэалізавана па Ўборскім сельсавеце пазыкі на 20 рубл. Бывалькаўскі сельсавет, які мае заданьне рэалізаваць пазыкі ў суме 12.700 руб., Дзеражыцкі сельсавет — 16.200 руб., Казероскі — 28.300 руб., Карпаўскі — 213.200 руб., Пярэдзяльскі — 14.070 р. на 25-VII не рэалізавалі ніводнага рубля. Ёсьць рад скажэньняў ў рэалізацыі пазыкі. Старшыня Старадубскага сельсавету (ён-жа і старшыня камсоду) Жураўскі, каб наладзіць работу арыштоўвае камісію садзейнічаньня.

Народны судзьдзя Лоеўскага раёну праводзячы сход у калгасе «Громкі», Ручаёўскага с.-с., прымушаў калгасьнікаў здаваць выплату на падпіску за адзін раз, чым зрабіў вялікі тормаз у распаўсюджваньні пазыкі. На сходах, паседжаньнях у раёне пазыцы аддаюць мала часу. Райком партыі на адным з сваіх паседжаньняў па пытаньні пазыцы аддаў 3-4 хвіліны. Ня ўсе раённыя працаўнікі, выязджалі, на вёску. Нават сам старшыня райкамсоду Радзіновіч з першай брыгадай ня выехаў.

Пры такіх тэмпах і адносінах да пазыковай кампаніі, якая мае вялікае значэньне ў фінпляне, мы стаім перад зрывам гэтай кампаніі.

Неабходна з усёй рашучасьцю ударыць па апартуністычных настроях. Зараз-жа мабілізаваць ўсю грамадзкасьць на выкананьне дадзеных дырэктыў па рэалізацыі пазыкі.

Брыгада Зубровіч, Абрамчык.

Рапортуем аб нашых дасягненьнях

Менск, ЦК КП(б)Б тав. ГЕЮ, СНК т. Галадзеду, НКФ т. Хацкевічу і рэдакцыі „Зьвязда"

Па Бялыніцкім раёне праведзена падпіска на пазыку «3-ці рашаючы» на 101 проц. У тым ліку сярод рабочых і служачых 151 пр., сярод калгасьнікаў 108 проц., сярод аднаасобнікаў 83 проц. У ліку афармленьня падпісні ўнесена селянствам 3300 руб. Падпіска працягваецца.

Сакратар РК КП(б)Б
**К

Аб правядзеньні закону пра самаабкладаньне

НА 1931 ГОД

УСІМ РАЙФА, ГАРФА І СЕЛЬСАВЕТАМ

У выкананьне закону пра самаабкладаньне на 1931 г. Народны Камісарыят Фінансаў БССР прапануе прыняць да кіраўніцтва наступныя паказаньні:

1. Калі самаабкладаньне на агульную патрэбу двох або некалькіх населішчаў абгаворваецца на асобным сходзе кожнага з іх, або, калі ў буйным населішчы скліканна сходы па асобных вучастках ці кварталах, дык пытаньне аб правядзеньні самаабкладаньня вырашаецца па агульнай колькасьці галасоў за і супроць на ўсіх сходах разам.

Увага: Калі на асобных сходах былі прыняты розныя процанты самаабкладаньня, пры чым пры падліку агульнай колькасьці галасоў атрымліваецца, што большасьць галасоў выказалася за меншы процант, дык для населішча прыняўшага большы процант гэты меншы процант не зьяўляецца абавязковым.

Прыклад 1. Пытаньне аб пабудаваньні аднае школы абгаворвалася на асобных сходах 3-х населішчаў (або кварталаў буйнага населішча). У выніку галасаваньня выказалася:

	За	Супроць
У першым населішчы (або квартале)	120	15
У другім	70	80
У трэцім	110	20
Разам:	300 гр.	115 гр.

Самаабкладаньне на будаваньне школы прынята і лічыцца абавязковым для ўсіх трох населішчаў (або кварталаў).

Прыклад II. Пытаньне аб пабудаваньні вэтэрынарнага пункту абгаварвалася і прынята на асобных сходах 4-х населішчаў (або кварталаў аднаго буйнага населішча), пры чым галасавалі за самаабкладаньне ў наступным процанту да сумы падатку:

	За 60 проц.	За 70 проц.	За 80 проц.
У першым населішчы (або квартале)	20 гр.	50 гр.	30 гр.
У другім	10 „	80 „	50 „
У трэцім	50 „	50 „	100 „
У чацьвертым	30 „	50	200 „
Разам	110 гр.	230 гр.	380 гр.

Лічыцца абавязковым для ўсіх зацікаўленых населішчаў (або кварталаў) самаабкладаньне на 80 проц.

Прыклад III. Пытаньне пра пабудову фэльчарскага пункту абгаворвалася і прынята на асобных сходах 3-х населішчаў (або кварталаў аднаго буйнага населішча). Пры чым галасавала за самаабкладаньне ў наступным процанту да сумы с.-г. падатку:

	За 70 проц.	За 85 проц.	За 100 проц
У першым населішчы (або квартале).	50 гр.	100 гр.	30 гр.
У другім	50 „	30 „	40 „
У трэцім	30 „	70 „	100 „
Разам	130 гр.	200 гр.	170 гр.

Лічыцца абавязковым для ўсіх трох зацікаўленых населішчаў (або кварталаў) 85 проц. самаабкладаньня, але паколькі трэцяе населішча прыняло самаабкладаньне на 100 проц., дык для яго і захоўваецца разьмер самаабкладаньня ў 100 проц.

2. Асобы, якія маюць крыніцы даходу ў розных мясцовасьцях, ці сталі жывуць у адным месцы, а крыніцы даходу маюць у другім месцы, а працягваюцца да самаабкладаньня ў кожнай з гэтых мясцовасьцяй, але з тым, каб агульная сума самаабкладаньня дадзенай асобы не перавышала сумы, якая можа быць налічана для данай асобы, згодна арт. 3 пастановы ЦВК і СНК БССР за 15-е жніўня 1931 г.

3. У дачных пасёлках ня могуць прыцягвацца да самаабкладаньня асобы, якія часова арандуюць дачы, кватэры, або асобныя пакоі на летні сязон і стала пражываюць у гарадох.

4. Калгасьнікі, якія ня маюць неаграмаджаных даходаў да самаабкладаньня ня прыцягваюцца. Неаграмаджанымі даходамі ад сельскай гаспадаркі для членаў калгасаў лічацца як крыніцы абкладаньня с.-г. падаткам (зямля, буйная жывёла, спэцгалёны), так і няпрыцягваныя да с.-г. падатку (сьвіноводства, птушкаводства, пчалярства і інш.).

5. Камуны, с.-г. арцелі і таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі, у якіх аграмаджаны рабочая жывёла і сельска-гаспадарчы інвэнтар, да самаабкладаньня ня прыцягваюцца.

6. Сума самаабкладаньня для некапэраваных саматужнікаў і рамесьнікаў, якія не займаюцца сельскай гаспадаркай і абкладаюцца падаходным падаткам, вызначацца, выходзячы з разьмеру налічанага на іх падаходнага падатку па даходах за асобы квартал 1930 г. х 4, і процанту, прынятага агульным сходам для аднаасобных працоўных гаспадарак.

Прыклад. Некапэраваны саматужнік па даходах за асобны квартал 1930 г. быў абкладзены падаходным падаткам у суме 20 рубл. Памножыўшы гэтую суму на 4 выходзіць, што гадавы аклад падаходнага падатку гэтага саматужніка складаў 80 руб. Калі па населішчы, дзе ён пражывае прынята самаабкладаньне ў разьмеры 75 проц. для аднаасобных працоўных сялянскіх гаспадарак, дык гэты саматужнік павінен заплаціць 75 проц. з 80 рубл.--60 рубл. самаабкладаньня.

7. Разьмер самаабкладаньня для рабочых, служачых і каапэраваных саматужнікаў і рамесьнікаў, не займаючыхся сельскай гаспадаркай і атрымліваючых зарплату звыш 75 руб. у месяц (арт. «і» п. 3 пастановы ЦВК і СНК БССР за 15-га жніўня) ўстанаўляецца наступным чынам: вызначаецца сума ўплачанага данай асобай падаходнага падатку за час з 1-га студзеня па 1-е жніўня 1931 г. (г. зн. за 7 мес.), а за астатнія 5 месяцаў (жнівень-сьнежань 1931 г.) сума падаходнага падатку вызначаецца, шляхам памнажэньня жнівеньскага акладу на 5, пасьля гэтага абедзьве сумы складаюцца (аклад падаходнага падатку за 7 мес. і за 5 мес.) і з атрыманай сумы вылічваюцца 75 проц., што і складае аклад самаабкладаньня для данай асобы.

Прыклад: Служачы заплаціў з 1 студзеня па 1 жніўня 1931 г. падаходнага падатку з заробітнай платы ўсяго 7 рубл., а за жнівень м-ц 85 кап. Жнівеньскі аклад памнажаецца на 5 і выходзіць, што за 5 месяцаў яго падаходны падатак складае 85×5=4 р. 25 к., а ўвесь яго гадавы аклад падаходнага падатку складае 7 р. + 4 р. 25 к. = 11 р. 25 к. Самаабкладаньне для гэтага служачага складае 75 проц. з 11 р. 25 к. Усяго—8 р. 44 кап.

8. Пры налічэньні самаабкладаньня серадняцкім гаспадаркам, якія вызваленыя поўнасьцю ад сельска-гаспадарчага падатку па розных прычынах, трэба выходзіць з 50 проц. налічанага на іх акладу сельска - гаспадарчага падатку і процанта самаабкладаньня прынятага па даным населішчу для аднаасобных працоўных сялянскіх гаспадарак, але ня менш разьмеру самаабкладаньня ўстаноўленага агульным сходам для аднаасобных бядняцкіх гаспадарак данага населішча вызваленых ад с.-гаспадатку па незаможнасьці.

Прыклад: Серадняцкая гаспадарка вызвалена ад налічанага сельгаспадатку ў суме 20 рубл. з прычыны таго, што член гаспадаркі закантрактаваўся і працуе на падземнай рабоце ў вугальнай прамысловасьці. Па вёсцы, дзе знаходзіцца гаспадарка прынята самаабкладаньне для аднаасобных працоўных гаспадарак у разьмеры 90 пр. сельгаспадатку. Паказаная гаспадарка павінна плаціць, выходзячы з палавіны нага акладу налічанага сельгаспадатку г. зн. з 10 руб. 90 проц., што складае 9 рубл. самаабкладаньня.

Калі разьмер самаабкладаньня для аднаасобных бядняцкіх гаспадарак, вызваленых ад падатку па нежаможнасьці ўстаноўлен агульным сходам у 10 рубл., дык паказаная вышэй серадняцкая гаспадарка вызваленая ад падатку павінна заплаціць самаабкладаньне ня 9 р., а 10 рубл.

9. Устаноўленыя літ. «з», арт. 3 пастановы ЦВК і СНК БССР за 15 жніўня стаўкі самаабкладаньня для гаспадарак з няўстаноўленымі даходамі тычацца тых гаспадарак, якія ў 1931 г. не абкладзены падаходным падаткам ня таму, што іх даход ніжэй неабкладаемага мінімуму, а таму, што фінансавыя органы не ўстанавілі крыніцы іх даходу але ўстаноўлена, што раней яны атрымоўвалі непрацоўныя даходы, напрыклад, был. гандляры.

10. Прыняты разьмер самаабкладаньня ў процантах да сельска-гаспадарчага падатку для аднаасобных працоўных гаспадарак і ўстаноўленыя агульным сходам цьвёрдыя стаўкі самаабкладаньня для іншых катэгорый насельніцтва запісваюцца ў пратакол агульнага сходу і абавязковы для ўсіх гаспадарак і ня могуць зьмяняцца для асобных гаспадарак як у бок іх паніжэньня, так і ў бок іх падвышэньня за выключэньнем выпадкаў, прадугледжаных у літ. літ. «а», «в» і «і» арт. 3 пастановы ЦВК і СНК БССР за 15-VIII, калі сельсаветы маюць права паніжаць разьмер самаабкладаньня асобным гаспадаркам.

Для калгасьнікаў, якія па сваіх неаграмаджаных даходах ня вызвалены ад сельска-гаспадарчага падатку, агульныя сходы павінны ўстанаўліваць неаднолькавую стаўку для ўсіх гэткіх гаспадарак паселішча (як гэта робіцца для іншых груп насельніцтва абкладаных па цьвёрдых стаўках), а розныя стаўкі самаабкладаньня (ў межах ставак, устаноўленых законам) для асобных гаспадарак у залежнасьці ад разьмеру, выплачванага гаспадаркай сельска-гаспадарчага падатку.

Прыклад. У вёсцы ёсьць 20 калгасьнікаў, якія плацяць с.-гаспадарчы падатак, пры чым 5 з іх уплачваюць падатак да 10 рубл. на гаспадарку, 12 гаспадарак звыш 10—да 15 рубл. падатку і 3 гаспадаркі звыш 15 рублёў падатку. Агульны сход можа ўстанавіць, што паказаныя калгасьнікі з разьмерам падатку да 10 руб. павінны плаціць самаабкладаньне 7 рубл. на гаспадарку, з падаткам звыш 10 да 15 рубл.—9 р. самаабкладаньня і з падаткам звыш 15 рубл.—12 рубл. самаабкладаньня на гаспадарку.

11. Літ. «ж», арт. 3 пастановы ЦВК і СНК БССР за 15-VIII—31 г. не распаўсюджваецца на служак рэлігійнага культу. Апошнія ўплачваюць самаабкладаньне ў разьмеры не правышаючым 100 проц. гадавога акладу сельска-гаспадарчага, або падаходнага падатку ў залежнасьці ад таго, які з гэтых падаткаў плаціць тэй, або іншы служнік рэлігійнага культу.

12. Граничны тэрмін выплаты самаабкладаньня, ўстанаўліваемы агульнымі сходамі (арт. 9 Саюзнага закону) ня можа правышаць 2 месяцаў з дню вынясеньня пастановы сходу аб правядзеньні самаабкладаньня.

13. Кулацкія гаспадаркі, абкладзеныя ў індывідуальным парадку, павінны заплаціць поўнасьцю налічаныя суммы самаабкладаньня ў 7-мі дзённы тэрмін. Для забесьпячэньня выплаты самаабкладаньня, сельскія саветы павінны рэбіць гарантыйныя вопісы маёмасьці гаспадарак, абкладзеных індывідуальна.

14. На працягу 2-х тыдняў з дню ўручэньня паведамленьняў, зацікаўленыя грамадзяне маюць права падаць у сельскі савет скаргі на пастанову аб самаабкладаньні наогул, а таксама на ўстаноўлены—разьмер самаабкладаньня. Скаргі павінны быць разгледжаны сельскім саветам у тыднёвы тэрмін.

15. Сельскі савет, адхіліўшы скаргу, павінен паведаміць асобу, якая падала скаргу аб падставе адхіленьня. На пастанову с.-савету могуць падавацца скаргі ў раённы выканаўчы камітэт. пастанова якога зьяўляецца канчатковай.

Падача скаргі ня прыпыняе выплаты самаабкладаньня.

16. Калі пастанова аб задавальненьні скаргі была вынесена пасьля ўплаты налічанай сумы самаабкладаньня, дык атрымаўшаяся пераплата павінна быць зьвернута.

17. Плацежы па самаабкладаньні прымаюцца ў парадку, устаноўленым для сельска-гаспадарчага падатку. але на асобных рэестрах. Прынятыя сумы запісваюцца ў паведамленьні платніка, а таксама ў асабовым рахунку (ў картцы ф. № 1-б па сельгаспадатку).

18. Уключаемыя ў сельскі бюджэт сродкі самаабкладаньня выдаткоўваюцца выключна на мэты ўстаноўленыя агульнымі сходамі грамадзян і асобна ўлічваюцца па сельскім бюджэце па асобным разьдзеле.

19. Паказаньне арт. 20 саюзнага закону аб выдаткаваньні Райвыканкомамі сродкаў, якія прызначаны на задавальненьне агульных патрэб некалькіх паселішчаў розных сельсаветаў, не адзначае ўключэньня гэтых сродкаў ў раённыя бюджэты і не зьмяняе агульнага парадку ўключэньня сум самаабкладаньня ў сельскія бюджэты. Гэта трэба разумець так, што выдаткаваньне сродкаў па самаабкладаньні сельсаветамі ў паказаных выпадках. будзе рабіцца па паказаньнях райвыканкомаў на прынятыя агульнымі сходамі грамадзян мерапрыёмствы міжпасёлішчнага значэньня.

20. Па пытаньні падліку і справаздачнасьці паказаньні будуць даны асобна.

Народны Камісар Фінансаў БССР
А. Хацкевіч.

Кір. сэктару масавых плацяжоў
Айзінсон.

№ П. С.
19 жніўня 1931 г.

Ня толькі здабыць, але высушыць і прыбраць

вось неабходныя ўмовы пасьпяховай барацьбы за ТАРФЯНЫ АПАЛ

Кіраўніцтва фабрыкі „Герой Працы" ня дбае аб забесьпячэньні торфам „Герой Працы"

Торф апалам лічыцца тады, калі ён высушаны і прыбраны

Змагаючыся за поўную рэалізацыю плянаў па торфаздабычы, мы не павінны забываць аб поўнай рэалізацыі плянаў па сушчы і вывазцы здабытага торфу. Усе, хто працуе непасрэдна па торфаздабычы, хто кіруе гэтай працай і ўся наша грамадзкасьць павінны добра ведаць, што **торф апалам лічыцца толькі тады, калі ён высушаны і прыбраны.**

Як-жа абстаіць справа з сушкаю па аб'яднаньні Белторфу? На гэта запытаньне адкажуць лічбы.

Да 15 жніўня 1931 г. высушана і заштабалявана ня больш як 25 проц. з ліку ўсяго здабытага торфу за сёлетні сэзон (здабыта 3000 тон). Па вестках Белторфу для сушкі не хапае 4000 чалавек.

Асабліва дрэнна з сушкаю на Асінторфе, дзе яшчэ ляжыць ня прыбраны торф, здабыты 5-6 тыдняў таму назад на торфазаводзе «Шлях Сацыялізму», «1-е Мая».

Горш яшчэ абстаіць справа з вывазкаю торфу. З выпрацаванага торфу за 1931 год патрэбна будзе вывезьці 460.000 тон і 60.000 тон з мінулага году. На сёньняшні дзень яшчэ ня вывезена ніводнай тоны. Белторф не паклапаціўся, каб распрацаваць пляны па сушцы і вывазцы торфу...

Райвыканкомам і райкалгассаюзам неабходна будзе аказаць самую шырокую дапамогу па забесьпячэньні торфавывазак падводамі, бо невыкананьне такой праграмы пагражае тым, што здабыты торф мы ня зможам скарыстаць.

Тодар Алесін.



Змагаючыся за здабычу торфу, не забываць аб сушцы і вывазцы

(ТОРФАЗАВОД «ДАВЫДАЎКА»)

На 9 жніўня сэзоннае заданьне па торфаздабычы выканана на 50,93 пр.

Прыехаўшая на торфараспрацоўкі брыгада з ФЗВ чыгункі паказвае добрыя прыклады работы, але сярод іх знайшліся такія, якія зусім ня цікавяцца пытаньнем здабычы торфу. Іх ня многа, але аб іх павінны ведаць усе, бо яны ўцяклі з адказьнейшага вучастку. Іх прозьвішчы: **Драздоў, Злотнікаў, Чачэрскі, Шацаў, Гапонаў, Кужалёў, Трэцякаўскі; Пазанкоў, Антоненкаў, Ільна, Прыбытчук, Цырульні кяў; Рабцоў, Трубадзелаў; Усэвіч і Абушанка.**

Бюро калектыву фабзавучу абгаварыла пытаньне адносна дэзэртыраў, пастанавіла выключыць іх з радоў камсамолу, прафсаюзу і з фабзавучу, а сябе абвясьцілі ўдарнікамі па выкананьні прамфінпляну на торфазаводзе.

Калі браць торфаздабычу па днёх, дык атрымаем наступны малюнак: 10 жніўня здабыта ўсяго фармовачнага, фрэзэрнага і гідраторфу 836 тон, альбо 57 проц. дзённага заданьня.

11 жніўня здабыта 376 тон альбо 26 проц. сутачнага заданьня.

12 жніўня здабыта 524 тоны альбо 36 проц. дзённага заданьня.

На 12 жніўня здабыта 31.832 тоны фармовачнага торфу. Заданьне сэзону 47 тысяч. Такім чынам праграма па здабычы фармовачнага торфу выкана на 73,3 пр. Па гідраторфу патрэбна было здабыць 30.000 тон, а фактычна здабыта 23.580,56 тоны.

Усяго здабыта за сэзон 65.407 тон, што складае сэзоннага заданьня 62,32 проц.

Брыгада Цімохава выканала свае заданьне на 127 проц. Напрадзе ідзе брыгада Гурэвіча. 12 жніўня брыгада Кавэрды зноў пачала павялічваць тэмпы па здабычы фармовачнага торфу: заданьне 36.000 цаглін, брыгада выпрацавала 53.700 цаглін.

Партыйныя, прафсаюзныя і грамадзкія арганізацыі павінны павярнуцца тварам да вывазкі торфу і поўнасьцю забясьпечыць вывазку, бо ў іншым выпадку вытворчая праграма фабрыкі «Герой Працы» будзе ў небясьпецы.

Я. Р.

Зводка выкананьня пляну па торфаздабычы на торфазаводах БССР за 15 жніўня 1931 г.

Назва торфазаводаў	% выкананьня
Ідуць наперад	
„Чырвоны Тарфянік"	123,7
„Закрэшынскі Мох"	117,4
„Бальшавік"	111,6
Адстаюць	
„Чырвоны Кастрычнік"	62,7
„Асінторф"	47,2
„Шлях Сацыялізму"	44,3
„Свабода"	46,7
„Чырвоны Сьцяг"	44,7
Не вылазяць з прарываў	
„Рэмізава"	8,1
„Смалявічы"	7,5
„Вольніца"	13,3
„Калектыўная Праца"	7,5
„Вялікі Мох"	19,3

Да Чырвонаштандарнага настаўніцтва БССР

Асьветнікі, на дапамогу Заходня-Сібірскаму краю!

Пасьпяховае разгортваньне будаўніцтва другой вугольна-мэталюргічнай базы на Ўсходзе—Урала-Кузьнецкага Камбінату прыкавала да сябе ўвагу рабочае клясы і пралетарскай грамадзкасьці ўсяго Савецкага Саюзу.

Рабочая кляса, усе працоўныя СССР добра зразумелі палітычную сутнасьць і значэньне пабудовы гэтага гіганта ў справе далейшага разгортваньня індустрыялізацыі і калектывізацыі нашай краіны, адсюль кожная арганізацыя, прадпрыемства, кожны рабочы паасобку імкнецца ў належнай ступені прыняць удзел у выкананьні гэтага баявога заданьня партыі па разьвязваньні Урала-Кузьнецкай праблемы.

Пасьпяховае вырашэньне гэтай вялікай задачы ў значнай ступені залежыць ад тэмпаў і размаху разгортваньня культурнага будаўніцтва на гэтым гіганце. У гэтай галіне перад намі стаяць надзвычайна вялікія задачы, у прыватнасьці, у галіне забясьпячэньня культурнага будаўніцтва Магнітагорска-Кузбаса на нацыянальнай мове працоўнага насельніцтва.

Вялікім тормазам у разгортваньні працы на культурным фронце зьяўляецца недахоп кадраў і асабліва кадраў для беларускіх школ. Заходня-Сібірскі край мае звыш 300.000 беларускага насельніцтва. У 1930-31 навучальным годзе там у сувязі з недахопам беларускіх пэдкадраў мелася толькі 11 школ I ступені і адна ШКМ.

У 1931-32 навуч. годзе патрэбна адчыніць новых 115 камплектаў і 3 ШКМ на беларускай мове, каб ахапіць 8000 дзяцей рабочых—беларусаў вучобай на іх нацыянальнай мове.

Перад асьветнікамі БССР стаіць канкрэтная задача: **даць Заходня-Сібірскаму краю 100 чал. настаўнікаў 1-га канцэнтру, 4-х грамадаведаў і 4-х фізматаўдаў.** Гэтая кантрольная лічба павінна быць ня толькі выканана, але і перавыканана не пазьней 25 жніўня.

Не адна сотня настаўнікаў перадавых вобласьцяй РСФСР (Масква, Ленінград і інш.) і УССР ужо працуюць у Заходня-Сібірскім Краі, змагаюцца за культурнае будаўніцтва 2-й вугольна-мэталёвай базы СССР.

Чырвонаштандарныя асьветнікі БССР, якія ня раз даказалі сваю адданасьць справе сацыялістычнага будаўніцтва, павінны з гонарам выканаць і гэтую задачу.

Патрэбна, каб кожная партыйная і камсамольская ячэйка асьветнікаў, кожнае раённае гарадзкое праўленьне, МК і сельсамы саюзу працаўнікоў асьветы сталі на чале выкананьня гэтага заданьня.

Справу вярбоўкі трэба перавесьці на рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, каб накіраваць у гэты пралетарскі край лепшых ідэалёгічна вытрыманых асьветнікаў, асьветнікаў-ударнікаў.

Баявое заданьне павінна быць на баявому выканана.

Прэзыдыум ЦП Праўленьня Саюзу Працасьветы БССР.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР
Гастролі муз. камэдыі пад кіраўніцтвам Міраева ЗВАНЫ КАРНЕВІЛЮ
Продаж білетаў у рабочай касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

Дзяржцырк
Поўная перамена праграмы. Гастролі ўноў прыбыўшых артыстых
Заслужоныя артысты ССРГ. Бр. ТАНЦІ музычныя сатырыкі
Лепшыя у СССР атракцыёны, міравыя рэкорды плаваньня ў паветры 6 Эльворці 6
Вышэйшае дасягненьне эквілібрыстыкі 2 Голядзе 2
Апошнія дні у адной клетцы бэрбэрыйскія львы і белыя палярныя мядзьведзі.
Новая групавая дрэсыроўка коняй А. В. Лапіада.
Выезд негрыцянскіх наезьнікаў жакеяў 4 Кук 4
Музычныя інструмэнталісты Вероніка | Выезд наезьдніка Пэрвіль | Спарт. акробаты Веомаш
Пачатак а 9 гадз. Льготныя білеты ў рабочай касе. Па заяўкам ФЗМК скідка 40 проц.

Кіно-тэатр Культура
З 17-га жніўня Ната Вачнадзе і Кторай у карціне ЖАЛЕЗНАЯ БРЫГАДА

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ"
Ад 15-га жніўня Парыскі шавец Звыш праграмы кіно нарыс № 15 Белдзярж іно.
Пачатак а 7 гадзіне. Каса а 5 гадз.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ"
Пашум, фільм па роману Войніча новы экз. ОВОД у гал. ролі Н. Вачнадзе
Пачатак а 2, 3-45, Вяч. а 7, 8-45 і 10-30 г.

„Чырвоная Зорка"
Сёньня і штодзённа Міс-Мэнд
Пачатак а 7 гадз.

ДА ВЕДАМА УСІХ ГАСПАДАРНІКАЎ
Бел. т-ва садзейнічаньня рацыяналізацыі вучоту (Бел ОРУ)
З верасьня адчыняе на 31-32 вучэбны год:
1. 8-МЕСЯЧНЫЯ КУРСЫ па павышэньні кваліфікацыі працуючых рахункових і статыстычных работнікаў РОЗНАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ
ПРЫЁМ толькі па камандыроўках устаноў і прадпрыемстваў
2. КАРОТКА-ТЭРМІНОВЫЯ КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ РАХУНКАВОДАЎ
для ўстаноў і прадпрыемстваў у гарадох і раёнах
Аб умовах даведвацца ў канцэляры ОРУ: (Савецкая, 55, уваход са двара тэл. № 11-99) ад 10 да 12 гадз. дня.
БЕЛ. ОРУ

АБ ПРЫЁМЕ НА ВЫШЭЙШЫЯ ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНЫЯ КУРСЫ
пры НКФ БССР у гор. Менску

1. Для падвышэньня кваліфікацыі кіруючых і апэрацыйна-адказных работнікаў фінансава-крэдытнай сыстэмы, а таксама для перападрыхтоўкі фін.-работнікаў іншых устаноў, пры Вышэйшых Фінансава-Эканамічных курсах НКФБ адчыняецца вячэрняя група для работнікаў гор. Менску.

Тэрмін навучаньня 2 гады.

Скончыўшыя курсы атрымліваюць вышэйшую адукацыю, набываюць спэцыяльнасьць фінансіста-эканамістага.

2. На курсы прымаюцца па камандыроўках адміністрацыі ўстаноў адпавядаючыя наступным запатрабаваньням: а) маючыя службовы фінансавы стаж ня менш 2-х гадоў; б) маючыя адпаведную агульную адукацыю.

3. У першую чаргу будуць прымацца члены партыі і УсеЛКСМ, а таксама лепшыя беспартыйныя з ліку ўдарнікаў і актыву.

У складзе прыманых павінны быць ня менш 25 проц. жаччын.

4. Узрост прыманых не старэй 40 гадоў.

5. Камандыруючыя ўстановы абавязаны на прынятых кандыдатаў унесьці за права навучаньня 300 руб. у год

6. Асобы, жадаючыя паступіць на курсы павінны падаць заявы з дадаткамі наступных дакумантаў: а) аб узросьце; б) аб адносінах да вайсковай службы (копія); в) аб адукацыі; г) аб стане здароўя; д) аб сацыяльным становішчы паступаючага і яго бацькоў (для служачых копію працоўнага сьпісу) і е) пасьведчаную анкету, камандыроўку ўстановы і дзьве фотаграфічныя карткі.

ЗАЯВЫ ПРЫМАЮЦЦА ДА 15-га ВЕРАСЬНЯ 1931 г.

Заявы накіроўваць па адрасу: г. Менск, Савецкая, 45, Сэктар Кадраў НКФ БССР
ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ З 1-га КАСТРЫЧНІКА

Кіраўнік Сэктару Кадраў НКФ БССР Спарыхін

МАГІЛЕЎСКАЙ ШКОЛАЙ ФЗВ МЭТАЛІСТАЎ
АДКРЫТ НАБОР на 105 чалавек
У НАСТУПНЫЯ ЦЭХІ:
такарны, сьлёсарны, ліцейны, мадэльны, кацольны і кавальскі
Прымаюцца скончыўшыя 7-годку. Усе паступаючыя забясьпечваюцца зарплатай 25 руб. у месяц і інтэрнатам.
Тэрмін падачы заяў да 1 верасьня. Дакументы накіроўваць Магілеўскаму аддзелу кадраў, альбо на імя школы Магілеў, Плеханава, 18.
Загадчык ФЗВ Цэхапенак

БЕЛАРУСКІ
Дзяржаўны Вышэйшы Пэдагагічны Інстытут
(рэарганізаваны з пэдфаку БДУ)
абвяшчае асеньні набор студэнтаў
НА НАСТУПНЫЯ ФАКУЛЬТЭТЫ І АДДЗЯЛЕНЬНІ:
I. Сацыяльна-эканамічны факультэт:
а) Аддз. эканоміі 60 асоб, з іх белсэкцыя 30 асоб, яўсэкцыя 30 асоб. Аддзяленьне рыхтуе выкладчыкаў эканамічных дысцыплін у тэхнікумах, рабфаках і ФЗУ.
II. Літаратурна-лінгвістычны факультэт:
а) на аддзяленьне рэдакцыйна-выдавецкае, якое рыхтуе стыльрэдактараў для выдавецтваў і рэдакцый буйных газэт—прымаецца 30 асоб
III. Пэдалёга-пэдагагічны факультэт:
а) па аддз. пэдалёгічнае, якое рыхтуе выкладчыкаў пэдалёгіі і навуковых працаўнікаў для дасьледчых устаноў—прымаюцца 30 асоб.
б) на інспэктарскае аддз., якое рыхтуе інспэктароў Нарасьветы і кіраўнікоў буйных навучальных устаноў—прымаюцца 30 асоб.
Заявы з дакумантамі вызначанымі ў даведніку НКА, прымаюцца ў канцэляры Пэдінстытуту (Менск, Універсытэцкі Гарадок, прыродазнаўчы корпус) да 20 жніўня 1931 г. Іспыты для тых тавар. шоў, якія ня маюць сярэдняе асьветы, будуць праводзіцца 27, 28 і 29 жніўня. Аб тэрміну пачатку заняткаў будзе паведамлена асобна. Правілы прыёму абвешчаны ў даведніку НКА аб паступленьні ў ВНУ.
Настаўнікі прымаюцца толькі па прадстаўленьні дазволу райінспэктароў Нарасьветы.
Стыпэндыямі і інтэрнатамі забясьпечваецца 70 п. ц. студэнцтва.
Дырэктар Пэдінстытуту В. РУДНІЦКІ

ПАПРАЎКА
У абяве Дзяржмэтру аб падачы заявак зьмешчанай у газ. „СБ" № 188 ад 16 жніўня надрукавана „прыём заявак на вагонавымеральнік усіх нумэнклятур" ТРЭБА ЧЫТАЦЬ вагавымеральнік усіх нумэнклятур

АБ'ЯВА
ЗГУБЛЕНА КРУГЛАЯ ПЯЧАТКА Будаб'яднаньня ВСНГБ ЛІЧЫЦЬ НЕСАПРАЎДНАЙ

АБ'ЯВА
Беларускі Дзяржаўны Вячэрні Універсытэт
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР СТУДЭНТАЎ
на Біолёгічны Факультэт
Заявы прымаюцца ў канцэляры БДУ (Менск, Універсытэцкі гарадок, галоўны корпус) штодзённа да 10 верасьня г. г. Правілы прыёму абвешчаны ў даведніку НКА аб паступленьні ў ВНУ.
Аб тэрміну пачатку заняткаў на Вячэрнім БДУ для прынятых студэнтаў будзе абвешчана асобна.
Стыпэндыямі і інтэрнатамі студэнты Вячэрняга БДУ не забясьпечваюцца.
Ч. в. п. рэктара БДУ В. Рудніцкі

Нарсуд Мсьціслаўскага раёну, на падставе прысуду ад 24 сакавіка г. г. па арт. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Астракову Цімоху Міхасёву старшыні Хлашчоўскага с.-с., за неабсьледваньне работы Курманаўскага с.-с. па загатоўках як упаўнаважны РВК.

Нарсуд Мсьціслага раёну, на падставе прысуду ад 3 красавіка г. г. па арт. 196 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне Зьліберу Саламону І. загадчыку Мсьціслаўскай хлебапекарні, за выдачу рабочым хлебапекарні ў неабмежаванай колькасьці хлеба (сапсаванага недапечанага) замест вотрубяй.

Нарсуд Калінкавіцкага раёну, на падставе прысуду ад 4-1 г. г. па арт. 196 з санк. 213 КК, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне загадчыку Калінкавіцкага лесгаспрамгасу Сініньнікову Пятру Мікалаяву і дзесятніку гэтага вучастка Гізунцэрману Хаіму Іцкаву, за нядбайныя адносіны да службовых абавязкаў.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэктараў,—6-15. Выдавецтва—2-44
падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., на год—12 руб.
Глаўлітбел № 598
Друкарня імя СТАЛІНА